ШКОЛЬНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ ПА-НОВАМУ

3

ЯК СТВАРЫЦЬ КАМФОРТ У ГАРАДАХ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 МАЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 103 (29217)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ШЧАСНЫ, рэктар Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта, член Савета Рэспублікі:

«Вялікая ўвага, якая з пачаткам распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі ўдзялялася і ўдзяляецца рабоце ўрачоў, таму, як яны праявілі сябе, а гэта без напышлівых слоў гераічная праца, істотна павысіць прэстыж нашай прафесіі, прыцягне ў шэрагі медработнікаў яшчэ больш людзей, шчыра адданых сваёй справе».

КАРАТКА

- **Беларусь атрымала ад МАГАТЭ лабараторыю для радыяцыйнага маніторынгу пры лясных пажарах.**
- У новую рэдакцыю закона аб турызме ўключылі фінансавую адказнасць тураператараў і ліцэнзаванне гідаў.
- **Fitch пацвердзіла рэйтынгі трох беларускіх дзяржаўных банкаў на ўзроўні B са стабільным прагнозам.**



- У Мінску пачнуць штрафаваць за паркоўкі на зялёных зонах з 1 чэрвеня.
- Пераможцаў 11 міжнародных алімпіяд будуць прымаць у ВНУ без уступных выпрабаванняў.
- **Адвакаты будуць бясплатна кансультаваць выхаванцаў дзіцячых дамоў-інтэрнатаў і жыхароў вёсак.**
- Беларусь захоўвае планы ўвесці біяметрычныя пашпарты ў 2021 годзе.

ISSN 1990 - 763X

ПРЫЛЯЦЕЛА ПТУШКА ШЧАСЦЯ

На адным з дамоў аграгарадка Смальяны, што на Аршаншчыне, намалявана вось гэтая птушка. У доме трыццаць гадоў жыве сям'я Сяргея і Ірыны МІРАНОВІЧАЎ. Столькі гадоў і птушцы. Аўтар малюнка — сама Ірына Паўлаўна. Жанчына назвала свой твор «Птушка шчасця».

— Калі мы засяліліся ў гэты дом, гэта было ўжо шчасцем. Марылі пра вялікую і дружную сям'ю, — кажа гаспадыня. — Тады я і намалявала сваю птушку, якая аберагае сямейны ачаг. Аказалася, што гэта быў сапраўдны талісман.

Цяпер у Ірыны і Сяргея цудоўная сям'я: двое сыноў і дачка ўжо выраслі, стварылі свае сем'і, ёсць двое ўнукаў. Сама Ірына шмат гадоў працуе паштальёнам на мясцовым аддзяленні сувязі — з газетамі, часопісамі і лістамі яна жаданая ў кожным доме аднавяскоўцаў. Калісьці здольнасць да творчасці адкрыў у ёй школьны настаўнік малявання. І хоць яна не стала прафесійным мастаком, прысвяціла сябе дзецям і ўнукам — але часта бярэ пэндзаль у рукі і малюе. Кожны год паднаўляе і гэты сямейны талісман.

Мне пашчасціла ўбачыць і сфатаграфаваць усю сям'ю Мірановічаў — тое самае шчасце, пра якое калісьці марыла гаспадыня.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Традыцыі і сучаснікі

Гісторыі жывая нітка

Такую назву атрымаў унікальны габелен, работа над якім працягваецца ў Гродзенскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці. Стварэнне эксклюзіўнай тканай карціны, прысвечанай 75-годдзю Вялікай Перамогі, доўжыцца ўжо некалькі месяцаў, і звыш 350 метраў нітак спатрэбілася ткачыхам, каб «сплесці» гісторыю — ад старажытнасці, увасобленай у элементах традыцыйнага арнаменту, сімвалічных кветках валошкі і папараці, да сучаснасці — зборнай гарадской панарамы ўсіх абласных цэнтраў нашай краіны.

СТАР. 3

Бізнес плюс экалогія

ТУРЫЗМ, РАМЕСНІЦТВА, ВЫТВОРЧАСЦЬ

Маштабны праект, накіраваны на развіццё сельскіх тэрыторый, распачынаецца на тэрыторыі заказніка «Спораўскі» ў даліне ракі Ясельды

Пра развіццё сельскіх тэрыторый у даліне Ясельды актыўна загаварылі ў самым пачатку гэтага года. Маштабны экалагічны праект, накіраваны на актывізацыю прадпрымальніцкай дзейнасці мясцовага насельніцтва Здзітаўскага, Міжлескага, Стрыгінскага і Спораўскага сельсаветаў Бярозаўскага раёна, рэалізуецца на тэрыторыі заказніка «Спораўскі». Прэзентацыя праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Ландшафтна-арыентаванае развіццё сельскіх тэрыторый даліны ракі Ясельды пры ўдзеле мясцовага насельніцтва» адбылася 10 студзеня ў Бярозе, што на Брэстчыне.

НА ЗЯМЛІ «СПОРАЎСКІХ СЕНАКОСАЎ»

Такая ініцыятыва, вядома, узнікла не на пустым месцы. З даўніх часоў людзі сяліліся, як вядома, каля самых рэк, і ўзнікалі першыя раёны земляробства. Тут, пры Ясельдзе, век жылі працавітыя людзі. А рэспубліканскі біялагічны заказнік «Спораўскі» — мясціна, вядомая як у нашай краіне, так і ў суседніх. На «Спораўскія сенакосы» ўжо шмат гадоў едуць аматары прыроды з блізкага і далёкага замежжа. Тут можна паглядзець на сапраўдныя балоты, на тэрыторыі заказніка нямала птушак, жывёлін, раслін, якія занесены ў Чырвоную кнігу.

СТАР. 4

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ПАСОЛ ПАВІНЕН СКЛЕЙВАЦЬ АДНОСІНЫ»

Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Сербія Велькам Кавачавічам. Сустрэча адбылася ў сувязі з заканчэннем паўнамоцтваў сербскага дыпламата.

Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы выказаў шкадаванне аб яго ад'ездзе, дадаўшы: «Вельмі спадзяюся і проста па-сяброўску хачу вас папрасіць, каб вы перадалі Прэзідэнту Сербіі, каб наступны пасол пасля вас быў такі ж, як вы».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў Беларусі сярод паслоў з'яўляецца ўсё больш сапраўдных сяброў. Ён успомніў рашэнне пасла Славакіі ў Беларусі Ёзафа Мігаша ўдзельнічаць сёлета ў парадзе Перамогі ў Мінску. «Гэта сапраўды годны быў учынак. Калі шчыра, мне не зусім зразумелая пазіцыя славацкага кіраўніцтва, якое асудзіла гэта. Ён вырас у сям'і патрыёта, бацька змагаўся з нацызмам, быў, наколькі я ведаю, партызанам. Ён (Ёзаф Мігаш. — **«Зв.»**) выступаў, казаў пра гэта шчыра. Ну як можна гэтаму чалавеку прад'яўляць прэтэнзіі?» — пракаментаваў сітуацыю беларускі лідар.

«Мы трапятліва падыходзім да прызначэння і вітаем прызначаных паслоў у Беларусі і хацелі б, каб яны былі сапраўднымі сябрамі, — дадаў кіраўнік дзяржавы. — Мы разумеем, што любы пасол будзе адстойваць інтарэсы сваёй краіны. Але пасол павінен склейваць адносіны сваёй краіны з Беларуссю, скажам, калі ты служыш у Беларусі».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што кіраўніцтва краіны вельмі зацікаўленае ў тым, каб з братняй Сербіяй былі добрыя адносіны і пасол адпавядаў ім.

«Мы з Прэзідэнтам, як заўсёды, гаварылі пра нашы двухбаковыя стасункі, пра нашы сяброўскія і братнія адносіны, — расказаў журналістам спадар Кавачавіч пасля сустрэчы з кіраўніком беларускай дзяржавы. — Прэзідэнт заўважыў, што адносіны, якія існуюць паміж Беларуссю і Сербіяй, — рэдкасць».

Па словах пасла, размова ішла і пра розныя канкрэтныя магчымасці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

«Напрыклад, Сербія чакае імпарту беларускіх электробусаў», — дадаў дыпламат.

«Што датычыцца мяне асабіста, гэта цяжкі момант — з'язджаць з краіны, якую любіш, — прызнаўся пасол. — Беларусь — дзівосная краіна! Вы тут жывяце і для вас гэта звыкла. Але калі паглядзець свежым поглядам і з адкрытай душой на Мінск і Беларусь, то бачыш усю прыгажосць гэтай краіны. Разам з тым беларускія людзі — яны проста цудоўныя! Я вяртаюся ў Сербію, але Беларусь і беларускі народ у маёй асобе заўсёды будуць мець сябра».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

У тэму

Сербія — адзіная краіна ў Еўропе, з якой у Беларусі дзейнічаюць двухбаковы Дагавор аб свабодным гандлі і бязвізавы рэжым.

Летась тавараабарот склаў каля 150 мільёнаў долараў, сальда было станоўчае ў памеры каля 13 мільёнаў долараў. У першым квартале гэтага года тавараабарот знізіўся на 30 працэнтаў, экспарт — удвая. У выніку склалася адмоўнае сальда.

Разам з тым экспарт беларускіх паслуг у Сербію актыўна расце (у 12 разоў за мінулы год і ў 11 разоў за першы квартал сёлета). Асноўная доля яго прыходзіцца на будаўніцтва часткі трубаправода «Турэцкі паток».

У Сербіі дзейнічаюць лініі па зборцы трактараў МТЗ і аўтобусаў МАЗ. Рэалізаваны праект па пастаўцы для МУС Сербіі 33 пажарных машын на базе шасі МАЗ. Вядзецца работа па арганізацыі паставак буйной партыі беларускіх аўтобусаў і тралейбусаў для Белграда.

У Мінску сербская кампанія «Дана Холдынг» будуе жылы комплекс «Маяк Мінска» побач з Нацыянальнай бібліятэкай і міжнародны фінансавы, дзелавы, забаўляльны і жылы комплекс «Мінск-Мір» на месцы былога аэрапорта. Кошт праектаў — 800 мільёнаў долараў.

«НАМ НІ Ў ЯКІМ ВЫПАДКУ НЕЛЬГА СТРАЦІЦЬ ЛЮДЗЕЙ»

Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам кіраўніка спраў Прэзідэнта Віктара Шэймана.

Беларускі лідар падкрэсліў, што яго перш за ўсё цікавіць сітуацыя ў падведамасных Кіраўніцтву справамі прадпрыемствах, на дзейнасць якіх уплываюць эканамічныя наступствы пандэміі новага каранавіруса, — а менавіта больш чым у 100 арганізацыях, размешчаных на тэрыторыі і за межамі Беларусі.

«Не ў кожнага міністра столькі прадпрыемстваў, — заўважыў Прэзідэнт. — Гэта працоўныя калектывы, тысячы людзей».

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якая там сітуацыя, дзе яна найбольш напружаная і якія кіраўнік спраў бачыць негатыўныя тэндэнцыі.

«Нам ні ў якім выпадку нельга страціць людзей, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Кіраўніцтва справамі — тут і бог загадаў, каб не было праблем... Трэба падтрымаць іх хоць пару месяцаў, пакуль адновіцца эканоміка ў свеце».

Беларускі лідар дадаў, што размова ідзе пра падтрымку не ўсіх агулам, а тых, хто найбольш пацярпеў з аб'ектыўных прычын — з-за зніжэння турыстычных патокаў ва ўмовах каранціну ў многіх краінах.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

МЕРЫ РЭАЛЬНАЙ ПАДТРЫМКІ

Прэзідэнт падпісаў важныя дакументы сацыяльнай накіраванасці.

Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 179 «Аб аплаце працы». Указам прадугледжваецца падтрыманне заработнай платы работнікаў бюджэтных арганізацый на ўзроўні, не ніжэйшым за памер мінімальнай заработнай платы, і ажыццяўленне ім адпаведных даплат у выпадку вымушанай няпоўнай занятасці або аб'яўлення прастою. У якасці дадатковай магчымай крыніцы фінансавання расходаў бюджэтных арганізацый у выпадку недастатковасці сродкаў ад дзейнасці, якая прыносіць даходы, вызначаны сродкі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

Таксама быў падпісаны Указ № 178 «Аб часовых мерах дзяржаўнай падтрымкі наймальнікаў і асобных катэгорый грамадзян». Дакументам прадугледжана магчымасць атрымання наймальнікамі субсідый для даплаты работнікам да мінімальнай заработнай платы пры іх вымушанай няпоўнай занятасці або аб'яўленні прастою ў перыяд з 1 мая да 31 ліпеня 2020 года, а таксама выплаты ўзносаў у дзяржаўны пазабюджэтны фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Рашэнне аб выдзяленні субсідый будзе прымацца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, а пералічэнне грашовых сродкаў — органам Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Указам таксама прадугледжана падаўжэнне да 31 жніўня 2020 года перыяду прадастаўлення дзяржаўнай адраснай падтрымкі ў выглядзе штомесячнай сацыяльнай дапамогі грамадзянам, у якіх у маі — ліпені 2020 года заканчваецца тэрмін дзеяння такой дапамогі.

Блізкая ўлада

Агучыць праблемы, задаць пытанні

Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператорчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі **ў суботу, 30 мая, з 9.00 да 12.00** правядуць:

намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Парламенцкі дзённік

Вялікае свята для маленькіх

Перад Днём абароны дзяцей члены Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве завіталі з такой мэтай у дзіцячы гарадок Ленінскага раёна Мінска.

Парламентарыі прывезлі падарункі і «цудоўны рамонак», на пялёстках якога пакінулі свае пажаданні. Расці здаровымі і дужымі дзецям і падлеткам дапамогуць кеглі, мячы, абручы, дыскі. А малыя, у сваю чаргу, падрыхтавалі сувеніры для гасцей — яркія малюнкі, на якіх адлюстравана ўсё самае галоўнае для чалавека: сям'я, здароўе, сяброўства.

«Хай сціпла, але ад душы вырашылі павіншаваць дзяцей. Дзеці — самае галоўнае, што ёсць у краіне. Малыя і моладзь заўсёды былі на першым месцы», — сказаў журналістам **дэпутат Аляксандр СОНГІН.**

1 чэрвеня дэпутаты працягнуць віншаваць дзяцей у сваіх выбарчых акругах, дапамогуць вырашыць пытанні канкрэтнага дзіцяці або ўстановы. Разглядаюцца праблемы малых беларусаў і на заканадаўчым узроўні: зараз у Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях, адзін з раздзелаў якога датычыцца непаўналетніх.

Варвара МАРОЗАВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

COVID-19 у ЗША: як чатыры вайны



За чатыры месяцы эпідэміі COVID-19 у ЗША загінула столькі ж амерыканцаў, колькі сукупна ў чатырох працяглых ваенных кампаніях — на Карэйскім паўвостраве, у В'етнаме, у Іраку і ў Афганістане, перадае Euronews. Агульная колькасць ахвяр перавысіла 100 тысяч чалавек, склаўшы траціну ад агульнай колькасці смяротных зыходаў у свеце ад каранавіруснай інфекцыі. Першы хворы быў зарэгістраваны ў штаце Вашынгтон у канцы студзеня. Пандэмія адбілася і на эканоміцы: 39 мільёнаў амерыканцаў цяпер зарэгістравана на біржы працы. Федэральныя ўлады настойваюць на аднаўленні эканамічнай актыўнасці, падкрэсліваючы пры гэтым, што рашэнні такога кшталту — прэрагатыва губернатараў.

Renault, Nissan і Mitsubishi плануюць уніфікаваць вытворчасць

Аўтамабільны альянс абвясціў маштабную рэформу з мэтай скарачэння выдаткаў і павелічэння канкурэнтаздольнасці. У рамках гэтага праекта да 2025 года Renault, Nissan і Mitsubishi павінны будуць сумесна распрацоўваць і вырабляць прыблізна палову сваіх мадэляў. «Такі падыход скароціць нашы ўкладанні ў распрацоўку мадэляў на 40 працэнтаў», — растлумачыў старшыня праўлення Renault Жан-Дамінік Сенар. Рэформа прадугледжвае стандартызацыю вытворчасці і выкарыстанне адзіных базавых платформаў для стварэння новых аўтамабіляў. Пры гэтым партнёры па альянсе падзеляць паміж сабой рынкі. Renault будзе адказваць за Еўропу, Расію, Паўднёвую Амерыку і Афрыку, Mitsubishi — за Паўднёва-Усходнюю Азію і Акіянію, а Nissan нацэліцца на Японію, Кітай і ЗША.

Венецыянскі кінафестываль пройдзе ў тэрмін



Ён адбудзецца з 2 да 12 верасня, паведаміла выданне Variety са спасылкай на губернатара рэгіёна Венета Луку Заю. Тым не менш венецыянскае біенале архітэктуры адклалі на наступны год з-за пандэміі каранавіруса. Звычайна даты абодвух мерапрыемстваў супадалі. Па словах Заі, для архітэктурнай выстаўкі спатрэбіцца дабудаваць неабходныя павільёны, у той час як для кінаагляду «ўсё гатова». Губернатар Венета і па сумяшчальніцтве член адміністрацыйнага савета кінаагляду падкрэсліў, што фестываль адбудзецца ў «эксперыментальным фармаце». Ён папярэдзіў, што сёлета будзе паказана менш фільмаў, чым летась. Гэта тлумачыцца рэжымам ізаляцыі, у якім апынуліся ў тым ліку кінематаграфісты па ўсім свеце.

Выпускнік-2020

ЭКЗАМЕНЫ: ПА АДНЫМ ВУЧНІ ЗА ПАРТАЙ

Навучэнцаў 9 і 11 класаў, якія падчас іспытаў хварэюць на COVID-19 або з'яўляюцца кантактамі першага ўзроўню, вызваляць ад экзаменаў. Адзнакі ў атэстат такім дзецям выстаўляць па выніках гадавых адзнак. Такая норма ўтрымліваецца ў пастанове Міністэрства адукацыі ад 26 мая № 101.

Падчас правядзення выпускных экзаменаў гарадскія, раённыя, занальныя і раённыя ў гарадах цэнтры гігіены і эпідэміялогіі будуць перадаваць у аддзел ці ўпраўленне адукацыі мясцовага выканкама спісы навучэнцаў, якія маюць інфекцыю, выкліканую COVID-19, а таксама звесткі пра навучэнцаў, якія знаходзяцца ў самаізаляцыі. «На падставе атрыманай інфармацыі мясцовыя органы кіравання адукацыяй адукацыі падрыхтуюць адпаведны загад і аператыўна давядуць яго да ведама ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Вучням у дакументы аб адукацыі будуць выстаўлены гадавыя адзнакі», — паведамілі ў прэс-службе галоўнага адукацыйнага ведамства.

Бацькі могуць удакладніць звесткі пра навучэнцаў, якія падлягаюць вызваленню ад выпускных экзаменаў, у тэрытарыяльных цэнтрах гігіены і эпідэміялогіі, аддзелах і ўпраўленнях па адукацыі мясцовага выканкама. Астатнія дзеянні — за мясцовымі органамі кіравання адукацыі.

Пры правядзенні выпускных экзаменаў усім установам агульнай сярэдняй адукацыі рэкамендавана забяспечыць захаванне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў — у прыватнасці, прадугледзець у месцах правядзення выпрабаванняў наяўнасць антысептыкаў і сродкаў індывідуальнай аховы, арганізаваць іспыты ў памяшканнях вялікай плошчы і забяспечыць іх належны санітарны стан. Кабінеты і мэбля ў іх (парты перш за ўсё) павінны быць старанна вымытыя. Памяшканні трэба добра праветрыць. Неабходна таксама забяспечыць рассаджванне ў навучальных кабінетах па адным вучні за партай ці прадугледзець дзяленне класа на дзве групы для рассаджвання ў двух кабінетах.

Пры правядзенні экзаменаў у вуснай форме неабходна скласці графік прыходу навучэнцаў на экзамен, каб пазбегнуць іх скаплення. «Можна, напрыклад, папярэдне разбіць іх на групы па пяць чалавек. Неабходна выключыць знаходжанне ў вучэбных кабінетах, дзе праводзяцца выпускныя экзамены, старонніх людзей. Знаходзіцца там могуць толькі члены экзаменацыйнай камісіі, якім рэкамендавана выконваць масачны рэжым падчас правядзення іспыту», — дадалі ў ведамстве.

Пра абавязковы масачны рэжым для навучэнцаў не паведамляецца.

Нагадаем, іспыты ў беларускіх школах пройдуць з 1 да 9 чэрвеня. Для навучэнцаў 9 класаў вызначаны тры даты — 2, 4 і 9 чэрвеня. У гэтыя дні выпускнікі базавай школы напішуць дыктоўкі па беларускай і рускай мовах і выканаюць кантрольную работу па матэматыцы. Для вучняў 11 класаў таксама ўстаноўлены тры даты для здачы пісьмовых экзаменаў — 1, 3 і 5 чэрвеня. Адзінаццацікласнікі будуць пісаць пераказ па беларускай або рускай мове (у залежнасці ад свайго выбару), выканаюць кантрольную работу па матэматыцы, а таксама здадуць у вуснай форме выпускныя экзамены па гісторыі Беларусі і замежнай мове. Што датычыцца канкрэтнага раскладу з указаннем, у які дзень і па якім менавіта вучэбным прадмеце пройдзе экзамен, то ён складаецца непасрэдна ў самой школе, гімназіі або ліцэі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Ракурс праблемы

ПРАВЯДЗЁМ КАНІКУЛЫ БЯСПЕЧНА!

Да гэтага дзяцей і іх бацькоў заклікаюць шматлікія службы

Сёлета на аб'ектах чыгункі ў краіне загінула двое дзяцей, за аналагічны перыяд мінулага года — дзесяць. На аўтамабільных дарогах пацярпела пяць непаўналетніх, 133 атрымалі траўмы. Асноўнай прычынай няшчасных выпадкаў паранейшаму застаецца ігнараванне элементарных мер бяспекі. Пра гэта расказаў старшы інспектар па асаблівых даручэннях упраўлення арганізацыі забеспячэння грамадскай бяспекі на аб'ектах транспарту Міністэрства ўнутраных спраў Уладзімір СЯСІЦКІ.

— Прафілактыка дзіцячага траўматызму — галоўная задача перад летнімі канікуламі як для педагогаў, так і для бацькоў. Па статыстыцы, 80 працэнтаў усіх ДТЗ, у якіх пацярпелыя — непаўналетнія, здараюцца па віне дарослых. Больш за палову здарэнняў адбылося тады, калі дзеці былі ў якасці пешаходаў, крыху больш за 40 працэнтаў — калі яны былі пасажырамі (дарэчы, амаль у палове выпадкаў іх перавозілі з парушэннямі патрабаванняў заканадаўства). На сёння супрацоўнікамі ДАІ ў школы для дзяцей перададзена больш за 20 тысяч лістовак з асноўнымі правіламі бяспекі на дарогах. Супрацоўнікі падраздзялення транспартнай міліцыі і РАУС на перыяд летніх канікул будуць забяспечваць ахову грамадскага парадку паблізу чыгуначных пуцей, плануецца суправаджэнне большасці цягнікоў, што курсіруюць да месцаў масавага адпачынку. Асаблівая ўвага будзе звяртацца на забеспячэнне бяспекі дзяцей на гэтых аб'ектах.

У краіне цяпер праходзіць традыцыйная акцыя «Увага — дзеці!», якая працягнецца да 5 чэрвеня, расказаў **прадстаўнік галоўнага ўпраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Станіслаў САЛАВЕЙ.**

— Яна скіравана на праблему забеспячэння бяспекі дзяцей на дарозе, павышэння ўзроўню адказнасці бацькоў і кіроўцаў. Дзяржаўтаінспекцыя заклікае апошніх быць вельмі ўважлівымі пры руху паблізу дзіцячых устаноў, праездзе нерэгуляваных пешаходных пераходаў, прыпынкаў грамадскага транспарту і асабліва ў дварах. У мэтах прадухілення траўматызму непаўналетніх у дні правядзення спецыяльных мерапрыемстваў рух транспартных сродкаў у светлы час сутак павінен ажыццяўляцца з уключаным блізкім святлом фар. Да таго ж інспектары ДАІ правядуць рэйды, дзе ўвага будзе ўдзяляцца выкананню кіроўцамі хуткаснага рэжыму, правіл праезду пешаходных пераходаў і бяспечнай перавозкі дзяцей. Акрамя таго, у летні перыяд Дзяржаўтаінспекцыя актыўна развівае і ўжо выкарыстоўвае дыстанцыйнае навучанне дзяцей у школах. Падчас рэйдаў супрацоўнікі ДАІ расказваюць непаўналетнім аб правілах бяспекі, праводзяць паўнавартасныя ўрокі.

Самыя цяжкія траўмы дзеці атрымліваюць пры падзенні з вышыні, расказаў **галоўны пазаштатны дзіцячы траўматолаг-артапед Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Станіслаў ТРАЦЦЯК.** «Катанне на роліках, веласіпедах — адзін з любімых дзіцячых заняткаў летам. Гэта добра, але многія бацькі эканомяць на налакотніках, накаленніках і падобных рэчах, што няправільна. Яны таксама павінны нагадаць школьнікам, што небяспечна рабіць сэлфі на дахах і лазіць па закінутых будынках. Сачыце за тым, каб каля акон не стаяла ніякая мэбля, з якой малое дзіця можа забрацца на падаконнік».

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Надвор'е

ЦЫКЛОН З БАЛКАН

Гэтымі днямі на нашу тэрыторыю выпадзе чарада выпрабаванняў: моцныя дажджы, навальніцы і ўраганны вецер

Вось ужо ў апошнія дні мая надвор'е насвавольнічае! А ўсё таму, што балканскі цыклон, нацэліўшыся на суседнюю Украіну, ужо сёння накрые Беларусь палямі дажджавых аблокаў і істотна павялічыць узровень ападкаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўмовы надвор'я ў краіне вызначаць актыўныя атмасферныя франты ад паўднёвага цыклону, цэнтр якога ў дзённыя гадзіны будзе знаходзіцца паміж Гомелем і Чарнігавам. Удзень на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюць моцныя дажджы, месцамі навальніцы.

У найбліжэйшыя выхадныя наша краіна трапіць пад уплыў актыўных маларухомых атмасферных франтоў ад таго ж цыклону, цэнтр якога перамесціцца на Бранскую вобласць. У суботу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць працяглыя дажджы, удзень па паўднёва-ўсходняй частцы — месцамі моцныя. У асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Вецер будзе паўночна-заходні, паўночны ўмераны, уначы па захадзе, удзень на большай частцы тэрыторыі — моцны парывісты. Уначы прагназуецца ад плюс 8 да плюс 15 градусаў, удзень — 13—20 цяпла, па паўночным усходзе — да плюс 23 градусаў.

Непагадзь чакаецца і ў нядзелю. У апошні дзень мая будзе воблачна, удзень з праясненнямі. Часам чакаюцца дажджы, уначы месцамі моцныя ліўні. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Вецер будзе паўночна-заходні, на большай частцы тэрыторыі — моцны парывісты. Тэмпература паветра складзе 8—15 цяпла, удзень — ад плюс 15 да плюс 20 градусаў, па поўначы краіны — да 22 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня атмасферны ціск вырасце, аблокаў і дажджоў стане менш, вецер пачне сціхаць. У панядзелак чакаецца пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер прагназуецца паўночна-ўсходні ўмераны. Уначы будзе ад плюс 6 да плюс 12 градусаў, удзень — 14—21 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Гісторыі жывая нітка

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

...Амаль кожны дзень у творчай лабараторыі Гродзенскага АМЦНТ шуміць вертыкальны ткацкі станок, аналагаў якому ў Беларусі няма. Яго яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя перарабіў з традыцыйных кроснаў вядомы майстар-тэкстыльшчык Фелікс Шунейка, а цяпер тэхналогію захоўваюць і перадаюць вучням яго дзеці. Алена Шунейка, якая амаль 40 гадоў працуе ў традыцыях так званага падвойнага і аднабаковага пераборнага ткацтва, упэўненая: кожны габелен, нават зроблены па адным макеце, — рэч штучная і непаўторная. «Стварэнне палатна сваімі рукамі — гэта творчасць, дзякуючы якой майстар не толькі зберагае традыцыі, але і дадае ў кожны выраб частку ўласнай душы і светапогляду», — разважае захавальніца ўнікальнага ткацкага рамяства.

Работа, у якой Алене Феліксаўне дапамагае маладая калега Юлія Барадзіна, вымагае цярпення і ўвагі, бо ніткі закладваюцца не чаўнаком, а рукамі, і можна перадаць на габелене нават дробныя дэталі. Добра, калі атрымліваецца выткаць два — два з паловай сантыметры палатна ў дзень, а бывае, што трэба спускацца на некалькі радоў назад і перарабляць. Многае залежыць і ад нітак (а яны ў карціне амаль усе натуральныя) — тоўстых ідзе менш, тоненькіх нашмат больш. Але галоўнае, кажуць ткачыхі, — знайсці падыходзячы колер. «Бывае, на палітры фарбаў не адразу патрэбныя падбярэш, а тут ніткі, — заўважае **вядучы метадыст па выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Юлія БАРАДЗІНА.** — Таму збіралі іх, дзе толькі знаходзілі — і самі па засеках парыліся, знайшлі, напрыклад, ніткі, якія фарбаваў яшчэ бацька Алены Феліксаўны — прайшло ўжо 50 гадоў, а яны трывалыя і якасці не страцілі. Некаторыя ніткі дарылі, шмат маленькіх рознакаляровых клубкоў прыносілі калегі, хтосьці нават кофты распускаў!»

Ніжняя частка палатна памерам 1,5х2 метры паказвае падзеі Вялікай Айчыннай вайны — тут франтавыя замалёўкі, партызанскія будні і, канешне, святкаванне Перамогі. Сярэдняя адлюстроўвае пасляваеннае адраджэнне краіны, аднаўленне і наладжванне быту вёсак і гарадоў. У верхняй, самай светлай, частцы знаходзяцца знакавыя архітэктурныя помнікі Беларусі: Холмскія вароты ў Брэсцкай крэпасці, Трыумфальная арка ў Магілёве, Фарны касцёл у Гродне, Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі, гарадская ратуша Віцебска і абеліск Перамогі ў Мінску. У кожным сюжэце вока чапляецца за карпатліва і з душой прапрацаваныя дэталі: маленечкія медалі на грудзях салдат Вялікай Айчыннай вайны, пэндзаль і палітра ў руках мастака, промні на зорцы, што вянчае абеліск... Аб'ядноўвае ж кампазіцыю, паводле задумы аўтара эскіза, прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Яўгена Шунейкі, непадуладная часу цэнтральная выява Маці-Беларусі, на руках у якой дзіця з птушкай — сімвал будучыні.

— Яшчэ ў лютым мы абвясцілі ў сацыяльных сетках конкурс на найлепшую назву для габелена, — расказвае **загадчык аддзела традыцыйнай культуры Гродзенскага АМЦНТ Вольга ШЛАВЯНЕЦ.** — Водгук аказаўся нават крыху нечаканы: атрымалі 96 варыянтаў назвы. Канчатковы варыянт — пераможцу конкурсу — «Гісторыі жывая ніць» — выбіралі калегіяльна, з улікам меркавання саміх майстрых, якім вельмі хацелася, каб назва перадавала сутнасць іх працы.

Цяпер ужо распачаўся трэці, апошні этап работы. Ткачыхі ў адзін голас кажуць, што «спяшаюцца павольна», але пастараюцца завяршыць эксклюзіўны габелен да канца чэрвеня, каб на Дзень Незалежнасці прадставіць яго для ўсіх ахвотных. Калі і дзе адбудзецца прэзентацыя — з улікам бягучай эпідэміялагічнай сітуацыі гэтае пытанне пакуль не вырашана, хоць, безумоўна, аўтарам тканай карціны — прысвячэння Перамозе хацелася б, каб іх падарунак Радзіме ўбачылі і ацанілі як мага больш беларусаў і замежнікаў. Але ўжо дакладна вядома, што аўтар назвы, імя якога абвесцяць на прэзентацыі работы, атрымае спецыяльны памятны падарунак ад Гродзенскага абласнога цэнтра метадычнай творчасці. А пакуль што з усімі этапамі рэалізацыі праекта, а таксама са шматлікімі майстар-класамі па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, якія распрацавалі цэнтры культуры і дамы рамёстваў Гродзеншчыны, можна пазнаёміцца дыстанцыйна — на сайце http://gromc.by і ў сацыяльных сетках Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота дадзена ДУК «Гродзенскі АМЦНТ».

ТУРЫЗМ, РАМЕСНІЦТВА, ВЫТВОРЧАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэты фестываль па ручным кашэнні балот і задумваўся як акцыя, што зверне ўвагу на праблему захаванасці балота і яго насельнікаў. Вяртлявая чаротаўка ды іншыя віды яе крылатых таварышаў становяцца часам ледзь не галоўнымі героямі такіх свят. Ім прысвячаюцца адмысловыя стэнды, тэматычныя прагляды, электронныя і друкаваныя альбомы. І, вядома, фэст — найперш магчымасць успомніць дзедаву касу. Спрадвечны спосаб касьбы прыцягвае на свята многіх людзей. Памятаю, як на першых фестывалях, больш за дзесяць гадоў таму, на балота прыходзілі сталыя мужчыны з суседніх вёсак, каб паглядзець на звычайную сялянскую працу. Адзін з іх сказаў тады мне тое, што помніцца да гэтай пары: «Найлепшая касьба — гэта калі косіш і душа радуецца». Цяпер і ў вёсках засталося зусім мала аматараў касы і такіх знаўцаў інструмента, якім быў герой Якуба Коласа ў «Новай зямлі». Памятаеце: «Другі хутчэй бы выбраў жонку, чым дзядзька добрую касу»? Сёння ў сельскай мясцовасці, на жаль, характэрны гук травы, што кладзецца ў пракосы пад вострым лязом, даўно растварыўся-згубіўся пад гулам трымераў. А названы фестываль дае магчымасць успомніць спрадвечныя клопаты беларусаў. Адным з галоўных раней была менавіта касавіца. Пра яе падрыхтоўку, саму работу, касцоў не раз расказвалі ўдзельнікі самадзейных гуртоў, якія абавязкова прыязджаюць на фестываль. Фэст арганізаваў заказнік «Спораўскі», абапіраючыся на традыцыі мясцовасці, якія тут даўно склаліся і перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

На «Спораўскіх сенакосах».

ЗЕМЛЯРОБЫ-ПЕРШАПРАХОДЦЫ

Традыцыйнай каштоўнасцю для тутэйшых жыхароў заўсёды быў дабрабыт, які ствараецца ўласнай працай. Такіх людзей можна знайсці ў кожным з пералічаных сельсаветаў, як і ў суседніх з імі.

У Спораве, якое дало назву і заказніку, і фестывалю гумару «Спораўскія жарты», і іншым мясцовым славутасцям, адчуваюцца наступствы ўрбанізацыі. Людзей становіцца менш, дзеці вяскоўцаў асядаюць у гарадах. Ва ўсім Спораўскім сельсавеце, паводле слоў **старшыні выканкама Аляксандра МАРТЫСЕВІЧА**, жыве зараз крыху больш за паўтары тысячы чалавек. Асноўная частка працаздольных людзей занята на мясцовым сельгаспрадпрыемстве, іншыя працуюць у лясніцтве, на меліярацыі, на аб'ектах сацыяльна-культурнага прызначэння, у арандатара на возеры. У самой вёсцы Спорава, напрыклад, няма ніводнага прыватнага прадпрыемства, ніхто нават не спрабаваў распачынаць сваю справу да нядаўняга часу.

Але ж, на шчасце, ёсць людзі, якія хочуць працаваць на зямлі, ствараць дабрабыт сям'і. Свайго кшталту першапраходцамі можна назваць Наталлю і Васіля Шчурко. Два гады таму яны ўзялі тры гектары зямлі і заняліся вырошчваннем ягад — эксперыментуюць з малінамі і клубніцамі. Цікава, што раней Васіль ездзіў на заробкі ў Расію, працаваў на будоўлях. З часам такая работа надакучыла: у вечных раз'ездах, харчаванне ўсухамятку... Вырашыў паспрабаваць свае сілы дома, на ўласным кавалку зямлі. І няхай для пачатку яны з жонкай арганізавалі рабочыя месцы толькі для сябе (праўда, у сезон наймаюць зборшчыкаў з ліку беспрацоўных), але з нечага трэба было пачынаць. Яны рызыкнулі, і ў іх многае атрымалася. Вось гэтым людзям сапраўды была б вельмі дарэчы дапамога, якую анансавала новая ініцыятыва, тым больш што цяжкасці, якія ўзніклі ў новых земляробаў, цалкам датычыліся рэалізацыі прадукцыі. А калі такіх гаспадароў будзе некалькі, ім дапамогуць аб'яднацца, каб разам знайсці вырашэнне праблем. Дасягнуць апошняга стане лягчэй пры падтрымцы пэўнай структуры.

На беразе Ясельды.

ЖЫВЁЛАВОД І ПРАДПРЫМАЛЬНІК

Як паведаміў **старшыня Стрыгінскага сельскага Савета Іван КРАГЕЛЬ**, на іх тэрыторыі прадпрымальных, ініцыятыўных людзей хапае. Напрыклад, нядаўна Дзмітрый Манюк, малады чалавек, які атрымаў профільную адукацыю, вырашыў заняцца сельскай гаспадаркай самастойна. На падворку Дзмітрыя ўжо ўтрымліваецца дзясятак кароў, ёсць авечкі, дамашняя птушка, участак зямлі для асабістай падсобнай гаспадаркі.

У тэлефоннай размове Дзмітрый расказаў, што невялікі стабільны прыбытак атрымлівае ад здачы малака, але хацеў бы пашыраць і развіваць гаспадарку. Пра магчымы ўдзел у праекце ведае, пакінуў сваю заяўку ў сельскім выканкаме, гатовы паўдзельнічаць ў конкурсе на грант.

Дзмітрый Жуковіч, выхадзец з вёскі Перасудавічы Стрыгінскага сельсавета, — больш вопытны прадпрымальнік. Дзмітрый Уладзіміравіч мае бізнес у горадзе, але і малую радзіму не забывае. У яго роднай вёсцы некалькі гадоў таму закрылі магазін. Людзей стала абслугоўваць аўтакрама, а памяшканне стаяла без справы. Прадпрымальнік узяўся за аднаўленне будынка, зрабіў належны рамонт, добраўпарадкаваў тэрыторыю. Словам, зрабіў цацачку з таго магазіна і адкрыў гандлёвы аб'ект для людзей.

— Вёска Перасудавічы невялікая, але гандлёвы пункт рэнтабельны, — сказаў Дзмітрый Жуковіч. — Мы сочым за попытам, абнаўляем асартымент, не накручваем цэны, у выніку маем пакупнікоў не толькі са сваёй вёскі, але і з суседніх населеных пунктаў, да нас і гараджане па пакупкі заязджаюць.

Прадпрымальнік нядаўна ўзяў яшчэ некалькі пустуючых участкаў зямлі, мае намер адкрыць у роднай вёсцы невялікую вытворчасць ды іншыя аб'екты сацыяльнага прызначэння. Планы, сапраўды, вялікія, і Дзмітрый Уладзіміравіч, як той казаў, дзвюма рукамі за рэалізацыю аб'яўленых праектаў, накіраваных на разняволенне ініцыятывы мясцовага насельніцтва, актыўны ўдзел людзей у развіцці рэгіёна.

ЦЭНТРЫ РАЗВІЦЦЯ І КОНКУРС ПРАПАНОЎ

Ужо адбылося некалькі канферэнцый па названай тэме. На апошняй за круглым сталом сустракаліся каардынатары праграмы і кіраўнікі раённай ды мясцовай улады. Як паведаміла **каардынатар праекта «Ландшафна-арыентаванае развіццё сельскіх тэрыторый даліны ракі Ясельда пры ўдзеле мясцовага насельніцтва» Алена АПОЛЬКА**, яго рэалізацыя на Бярозаўшчыне пачынаецца з ацэнкі патэнцыялу развіцця прадпрымальніцтва на тэрыторыі названых сельсаветаў і стварэння сістэмы кіравання экарэгіёнам. У цэнтрах развіцця, якія будуць створаны ў кожным сельсавеце, жыхарам дапамогуць распрацаваць свае мясцовыя ініцыятывы. Там чакаюць людзей, зацікаўленых развіццём турызму, рамесніцтва, удасканаленнем сферы паслуг, вытворчасці і арганічнага земляробства, а таксама тых, хто прапануе праекты па захаванні прыроднай і гістарычна-культурнай спадчыны рэгіёна. Далей на конкурснай аснове будуць выбраны лепшыя прапановы, на рэалізацыю якіх выдзелена 280 000 еўра. Усе вышэйпералічаныя гаспадары, работнікі, прадпрымальнікі могуць прэтэндаваць на ўдзел.

На канферэнцыі ў студзені ішла гаворка пра тое, што праз тры гады ў даліне ракі Ясельды жыццё павінна змяніцца. Там з'явяцца новыя віды бізнесу, арыгінальныя брэнды і прадукцыя з мясцовай сыравіны, вырасце попыт на турыстычныя паслугі, з часам будуць аказваць новыя віды паслуг. Усё гэта стане рэальнасцю, калі людзі возьмуцца і зробяць. Падтрымка цалкам рэальная.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Культасвета

Гісторыя пад адкрытым небам

Афіцыйна выставачны праект «Рарытэты Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь» пачне працаваць з 3 чэрвеня, але маляўнічыя банеры з выявамі гісторыка-культурных каштоўнасцяў нашай краіны ўжо з'явіліся на агароджы сталічнага парка Чалюскінцаў.

Іх 70, і, канешне, гэта вельмі мала для таго, каб адлюстраваць усё багацце і непаўторнасць нацыянальнай культурнай спадчыны. Таму на здымкі трапілі «самыя-самыя» рэдкія і каштоўныя прадметы з фондаў усіх пяці філіялаў гістарычнага: музеяў сучаснай беларускай дзяржаўнасці, гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, гісторыі беларускага кіно, прыроды і экалогіі, Дома-музея І з'езда РСДРП. На выстаўцы пад адкрытым небам можна ўбачыць і прачытаць на беларускай, рускай і англійскай мовах пра традыцыйныя ўборы і слуцкія паясы, прадметы рэлігійнага культу, мастацкія палотны, у тым ліку партрэты знакамітых дзеячаў Беларусі, музычныя інструменты і зброю, манеты і ўзнагароды, узоры народных промыслаў і рамёстваў, старадаўнія кнігі...

— Выбіраючы экспанаты для гэтага праекта, мы стараліся максімальна поўна прадставіць розныя музейныя калекцыі і самыя цікавыя, рэдкія і каштоўныя рэчы з фондаў, — гаворыць **дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Павел САПОЦЬКА.** — На кожным банеры прадстаўлена некалькі экспанатаў, так што агульную іх колькасць на выстаўцы можна смела памнажаць на чатыры. А ў перспектыве, канешне, было б здорава, каб людзі, якія ўбачаць гэты выставачны праект, зацікавіліся і прыйшлі памнажаць і паглыбляць свае веды пра гісторыка-культурную спадчыну Беларусі ўжо непасрэдна ў музей, на нашы пастаянныя і часовыя экспазіцыі.

Нагадаем, агароджа парка культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў у Мінску далёка не ўпершыню становіцца выставачнай пляцоўкай. Цяперашняя маштабная экспазіцыя, аўтарамі якой выступілі Алег Лукашэвіч, Аляксандр Аляксееў, Алег Ладзісаў і Дар'я Аўчыннікава, прадстаўлена пры падтрымцы Міністэрства культуры і Мінскага гарвыканкама. Плануецца, што працаваць — даступна і цалкам бясплатна для ўсіх наведвальнікаў — выстаўка будзе як мінімум на працягу года.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

На сцэне

«КАРАЛЯ ЛІРА» КУПАЛАЎСКАГА ТЭАТРА ПАКАЖУЦЬ АНЛАЙН

Адну з галоўных тэатральных прэм'ер гэтага своеасаблівага сезона — спектакль па славутай шэкспіраўскай трагедыі «Кароль Лір» Мікалая Пінігіна — сёння можна будзе паглядзець анлайн. Пастаноўка рыхтавалася як адна з ключавых падзей сотага сезона Купалаўскага тэатра. Па сутнасці, яна такой і стала, але паколькі праз каранавірус пакуль не можа паказвацца гледачу традыцыйным чынам, відэасэрвіс VOKA забяспечыць яе анлайн-трансляцыю.

Гэта будзе чарговым мерапрыемствам у гонар юбілею Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы — якія часы, такія і святкаванні. Прэм'ера спектакля адбылася 26 снежня мінулага года, і пастаўлены мастацкім кіраўніком Купалаўскага Мікалаем Пінігіным «Кароль Лір» выклікаў рэзананс.

Галоўную ролю наравістага Ліра тут іграе Віктар Манаеў. Па сюжэце кароль, перад тым як адысці ад улады, раздзяляе каралеўства паміж дзвюма дочкамі, а трэцюю, любімую, высылае з краіны, бо тая адмовілася апісаць сваю да бацькі любоў. З акта самадурства Ліра пачынаюцца інтрыгі, страсці і вар'яцтва. Ролі дачок у трансляцыі выконваюць Вікторыя Чаўлытка, Валянціна Гарцуева і Марта Голубева.

Гэтая трагедыя Шэкспіра на купалаўскай сцэне была пастаўлена ўпершыню. Для яе сцэнічнага ўвасаблення быў узяты пераклад Юркі Гаўрука. Варта адзначыць і ўбачыць сцэнаграфію і касцюмы спектакля, падрыхтаваныя мастачкай Кацярынай Шымановіч.

Паказ «Караля Ліра» ў прамым эфіры адбудзецца а сёмай гадзіне сёння, 29 мая, на сайце voka.tv альбо ў мабільнай праграме VOKA.

Вольга МІЦКЕВІЧ.



КАНЦЭРТ У... КАНЦЭРЦЕ

Адбылася гэтая гісторыя гадоў з пятнаццаць таму, але помніцца паранейшаму добра.

Значыць, лета на дварэ, жнівень. З поля ўбралі збожжавыя, у працы вяскоўцаў наступіў кароткі перадых. А да яго якраз даляцела чутка, што ў раёне гастралюе спявачка Ірына Дарафеева, што ў нядзелю ў недалёкім ад нас мястэчку адбудзецца вялікі канцэрт.

Не скарыстацца такой магчымасцю проста грэх, бо калі яшчэ выпадзе?

Карацей, мы з сям'ёю сабраліся ехаць: за гадзіну-другую да пачатку ў багажнік паклалі табурэтку (на ўсякі выпадак, каб нашай бабулі было дзе сесці), у гародчыку нарэзалі самых прыгожых кветак і...

Мы загадзя прыехалі: на пляцоўцы каля школы поўным ходам ішлі апошнія прыгатаванні, народу збіралася ўсё больш і больш...

А вось ужо і спявачка — прыгожая, узнёслая, хораша прыбраная... Павітала ўсіх, заспявала... Грымнулі апладысменты, да сцэны рушылі хлопцы з прыгожымі вяргінямі.

Ішлі яны, праўда, неяк няўпэўнена — хісталіся трохі з боку ў бок. Аднак артыстка ўзяла іх кветкі, хораша падзячыла... Заспявала новую песню, а потым яшчэ...

Не паспела закончыць, як тыя ж двое прыхільнікаў няцвёрдай хадой, але ж навыперадкі, зноў панесліся да сцэны — ужо з букетамі астраў... А напярэймы ім з іншага кута заспяшаўся старшыня сельсавета — мужчына вельмі аб'ёмны. Не, ён не бег, але гэтак спрытна перабіраў нагамі...

Затрымаў аднаго з фанатаў (мусіць, зрабіў вымову — папрасіў не перашкаджаць спявачцы?). Другі ў гэты час быў на сёмым небе ад шчасця, бо такі прарваўся — данёс, аддаў Дарафеевай кветкі!..

І трэба сказаць, што гэта быў толькі пачатак... канцэрта ў канцэрце, бо мы, гледачы, з асалодай слухалі песні, а паралельна — сачылі за хлопцамі, якія раз-пораз насілі спявачцы кветкі.

Дзе бралі? Па-першае, у зале, у іншых людзей, якім не хапала, можа, адвагі ісці да сцэны, а па-другое...

Трохі пазней, пасля канцэрта, стала вядома, як моцна пацярпелі кветнікі каля хат, размешчаных непадалёк ад школы.

...Без сумневу, у заслужанай артысткі Ірыны Дарафеевай было вельмі шмат розных незабыўных сустрэч і памятных канцэртаў. А ў нас — вось гэты.

Ірына Салата,

г. Гродна.

ВЫЙСЦІ ЗАМУЖ — ТРЭБА ЗНАЦЬ...

У той цёплы жнівеньскі дзень я выпадкова апынулася на вакзале: праводзіла сяброўку ў вёску да бабулі, памахала ручкай услед цягніку, а далей, як той казаў, аслупянела, бо ўбачыла... Яго — хлопца сваёй мары: прыгожая постаць, мяккі, славянскі тып твару, уважлівыя шэрыя вочы...

Што цікава, яны таксама глядзелі на мяне — захоплена, радасна. Яны казалі: «Анёл мой, я рады вас бачыць!»

І гэта не вельмі мяне здзівіла, бо ў свае 18 я не толькі помніла крылатае: «У чалавеку ўсё павінна быць прыгожым...» Пасля пятага класа, у піянерскім лагеры, я, можна сказаць, не спускала вачэй з нашай важатай. У яе, Паліны, быў вельмі худы, выцягнуты твар, доўгі кручкаваты нос... Але пры гэтым — капа залатых валасоў, постаць каралевы, голас як звон ручайка. Да таго ж акуратнае моднае адзенне, лёгкі макіяж, туфелькі на шпільках, усмешка...

Іншымі словамі, нарадзіўшыся зусім непрыгожай, Паліна была прыгажуняй!

Вось і я з усіх сіл старалася. Ва ўсякім разе, у той дзень прыбралася ў сукеначку сонца-клёш з цудоўным шалічкам, у туфлі-лодачкі. Валасы — колеру спелай саломы (я ж на хімфаку вучуся!) — сабраны ў прычоску «Афіцэры, за мной!».

І, як высвятлялася, не толькі яны?

...Хлопца звалі Колем. Мы пазнаёміліся, я даведалася, што ён таксама студэнт, праўда, сталічнай ВНУ (а я — віцебскай), што тут, у гэтым горадзе, жыве яго бабуля, што мы абое любім марожанае, кнігі і кіно, што зараз ён едзе ў Мінск...

Адтуль на мой адрас хутка паляцелі пісьмы. І чым больш іх было, тым часцей я лавіла сябе на крамольнай думцы (мне ж яшчэ вучыцца і вучыцца — другі курс), што Коля — якраз тое, што трэба: мой чалавек, мая палавінка.

Ды і я — магчыма — яго?.. Ну раптам? Хоць тады, вядома ж, на каханне ніякіх намёкаў і ніякіх прызнанняў, бо з чаго б, калі мы толькі-толькі пазнаёміліся, калі паміж намі ўсяго і было, што некалькі гадзін на вакзале, некалькі порцый марожанага?

Наступная сустрэча магла адбыцца зімой: Коля пасля сесіі збіраўся прыехаць да бабулі ў Віцебск, а напярэдадні нашу суседку запрасілі на вяселле да пляменніцы. На мяне яна пакідала сваю кватэру і ў ёй — малога катка, Афоню. Такім чынам, да экзаменаў я рыхтавалася за чужым сталом, у перапынках — пісала пісьмо... А кацяня гэтым часам стала адбіраць маю ручку — прасіць, каб я з ім гуляла...

Ну і як тут было адмовіць, калі яно такое прыгожанькае, такое пушыстае, мілае...

Карацей, Колю я напісала пра тое, што адчувала і бачыла, прычым без намёкаў, што Афоня — проста кацяня...

Адказ на гэты ліст быў вельмі хуткі і гэтакі ж злы. Коля пісаў, што я яго падманула: ён, маўляў, да мяне ўсёй душой, а вось я, маючы іншага і такога ўжо ўлюбёнага кавалера, зводжу з розуму яшчэ і яго... Навошта?!

...Адказаць на гэтае досыць смешнае для мяне пытанне я збіралася пры сустрэчы, нават, калі выпадзе, можа, і пазнаёміць Колю з Афонем. Уяўляла, як гэта будзе, як здзівіцца і засмяецца Коля.

Аднак здзівілася я сама. І не менш.

Неяк да нас у дзверы пастукалі, я адчыніла і ўбачыла за парогам прыгожую дзяўчыну сваіх гадоў. Яна ўдакладніла, ці я перад ёй, а потым працягнула мне... мой ліст да Колі, сказала, што знайшла яго выпадкова ў... мужа (?!) ў кішэні, што яны жанатыя ўжо чатыры гады.

— Мне здаецца, — казала Вера, — што Коля закахаўся. Інакш не насіў бы з сабой гэты ліст, не перачытваў яго... Але ж у нас — сям'я, дачушцы трэці гадок... Ды і ў вас — я прачытала — ёсць «мілы Афоня», дык адступіцеся, не пішыце яму, не сустракайцеся — не бурыце наша жыццё.

Не ведаю, чаму я тады не рассмяялася (хоць вельмі хацелася).

Не ведаю, куды — і, можна сказаць, імгненна — зніклі ўсе пачуцці да Колі. А вось розум — наадварот — уключыўся.

— Пакладзіце гэты ліст назад у кішэню, — параіла я сваёй госці. — І нічога не бойцеся (ва ўсякім разе — з майго боку). Колю я напішу праўду: што люблю Афоню, што ў нас з ім хутка вяселле.

...Калі выходзіла з дому, каб занесці гэты ліст у паштовую скрынку, «жаніх» мой, разлучнік Афоня, выбег насустрач — пацёрся аб ногі, папрасіўся на рукі.

Я з задавальненнем падняла яго, патрапала за вушкі, пагладзіла па пяшчотнай шыйцы, хоць ён, як кандыдат у «мужы», мог чакаць яшчэ і прысмакаў.

Зоя Наваенка,

г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.

ГАЛАВУ МОЖНА ВЕШАЦЬ,

ламаць, сушыць, намыльваць...

Але не губляць!

Жыццё ёсць жыццё: нехта ў ім нешта губляе (найчасцей у транспартных сродках), нехта знаходзіць. Для гэтага, наколькі ведаю, нават спецыяльныя бюро створаны пры метрапалітэнах, аўтобусных ды тралейбусных парках. І што толькі туды не трапляе: сумкі, планшэты, кашалькі, парасоны, тэлефоны, фотаапараты... Не кажучы ўжо пра дробязь накшталт тэнісных ракетак ці пальчатак-рукавіц, калі, згубіўшы адну, не будзеш карыстацца і другой... Хіба, можа, пару знойдзеш, як Прынц з Папялушкай? Але ж гэта — хутчэй выключэнне, бо іншых людзей, якія нешта згубілі, шчаслівымі не назавеш.

Дык вось. Хто-ніхто з маіх аднакурснікаў пасля заканчэння Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі застаўся працаваць на кафедрах, з часам атрымаў вучоныя званні і ўжо ў якасці выкладчыкаў стаў ездзіць у профільныя каледжы ды сярэднія навучальныя ўстановы, каб параіць маладым вучыцца далей — якраз у акадэміі.

Той раз у камандзіроўку збіраліся двое — Іван Іванавіч (назавём яго так), загадчык кафедры, кандыдат навук, і зусім малады аспірант.

Апроч асабістых рэчаў, яны бралі з сабой (калегі вельмі прасілі) аб'ёмны сакваяж з метадычнай літаратурай. На вакзал яго прынёс аспірант, ён жа ўладкаваў кнігі на багажнае месца ў вагоне. Цягнік крануўся.

Колькі там часу прайшло, я сказаць не бяруся, але ж правадніца аб'явіла, што хутка іх станцыя — Пінск. Усхваляваны Іван Іванавіч прыліп да вакна, бо цягнік павінен быў сустракаць наш агульны аднакурснік, ён жа дырэктар мясцовага каледжа. Так і ёсць! Прыехаў! Іван Іванавіч заспяшаўся насустрач. Аспірант, баючыся адстаць, рушыў следам за ім.

На пероне пачаліся абдымкі, першыя пытанні пра здароўе, сям'ю, работу, пасля чаго Іван Іванавіч з форсам заявіў: «Мы там рознай літаратуры для вас прывезлі... Віця, пакажы», — павярнуўся ён да маладога калегі, і той, якраз у тую ж мінуту, зразумеў, што і сакваяж, і дыпламат з асабістымі рэчамі паехалі ў бок Варшавы...

Чым скончылася гэта гісторыя? Тым, што дырэктар каледжа хутка знайшоў дзяжурнага па станцыі, той звязаўся са сваімі калегамі ў Брэсце, з начальнікам цягніка, які на наступнай станцыі перадаў забыты багаж на пасажырскі цягнік «Варшава — Масква».

І такім чынам яшчэ раз пацвердзіў крылатае: «Абы галаву не згубіць... Усё астатняе, дасць бог, знойдзецца».

Валерый Гаўрыш,

г. Чавусы.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

ДЗЕСЯЦЬ ДЗЁН, ЯКІЯ НЕ ЗМЯНІЛІ СВЕТ

Нататкі адпускніка ў час пандэміі

ПЕРШАЕ, на што звяртаеш увагу ў вясковым адпачынку, — суцэльная цемра і пранізлівая цішыня ўначы. Такое спалучэнне, здаецца, — самае што ні ёсць найлепшае для спакойнага моцнага сну. Але ж менавіта ад яго прывыкламу да іншага гараджаніну ў першую ноч зусім не засынаецца. Доўга ўглядаешся ў тое месца, дзе ў хаце акно, — і нарэшце бачыш светлыя прамавугольнікі шыбаў і фортак, якія ў дзяцінстве здаваліся нейкім вялізным тварам — лоб, вочы, шчокі... Прыслухоўваешся да цішыні — і раптам чуеш, як нехта гучна гупае зверху аб падлогу, павольна і цяжка, моцна сапучы, пасоўваецца да твайго ложка (а гэта кошка саскочыла з шафы). Невыносна звонка цікае гадзіннік (маленькі будзільнік на серванце) — і ты не лянуешся, устаеш, ідзеш басанож па настылай падлозе, нясеш яго ў іншы пакой. Ціканне не змаўкае, але хоць становіцца цішэйшым. Пад яго правальваешся ў сон, толькі ненадоўга — на світанні, гадзін у пяць, пачынае ціўкаць пад самымі вокнамі нейкая птушка, пранізліва-задзірыста паўтараючы здзекліва: «Спіцё? Спіцё? Спіцё?» А там і сонца пачынае біць промнямі ў вокны, і ўжо немагчыма моцна заснуць, бо занадта відна...

- часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• не позднее одного месяца с момента подписания акта приема-передачи получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• заключить договор на разработку проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома в течение 20 календарных дней с даты получения разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и в срок, не превышающий 3 месяцев с даты заключения данного договора, обеспечить ее изготовление;

• представить изготовленную проектную документацию для утверждения в Брестский городской исполнительный комитет в течение 30 календарных дней с даты ее изготовления;

• завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;

• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Аукцион состоится 30 июня 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал.
Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 29.05.2020 г. до 17.30 24.06.2020 г. (перерыв с 13.00 до 13.45; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23.
Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www gki.gov.by

Песню бярыце з сабою...

ТВАЁ ІМЯ

Рубрыку вядзе Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com

Міхась Пазнякоў (нар. у 1951) — вядомы паэт, празаік, перакладчык, крытык, мовазнаўца. Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшыня яго Мінскага гарадскога аддзялення. Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, прэміі імя П. Броўкі, прэміі «Найлепшая кніга года», прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і іншых. Аўтар кніг паэзіі «Колер радасці», «Час надзеі», «Любі і помні», «Святое правіла...» і іншых.

**Вершы — Міхась ПАЗНЯКОЎ,
музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.**

1. Не збаюся ні шэптаў,
ні звадаў,
Хіба можа каханне
грашыць?
Прыхаваныя шаблі
паглядаў
Не зрубцуюць высокай
душы.

Прыпеў:
Тваё імя шаптаў
малітваю,
Увесь сусвет мне быў
табой.
І верыў, што ўсе буры
выстаю
З тваёю шчырасцю
святой.
Хай незагойнай,
вечнай ранаю
Душу маю і апякла —
Удзячны, што маёй
каханаю,
Маёй адзінаю была...
2. Нечаканай прыйшла,
неспазнанаю.
Незямным атуліла
цяплом,
Самай чыстай і
велічнай тайнаю,
Адарыла шчаслівым
крылом.

Прыпеў.
3. Мрою сонечны
позірк адчайна,
Сонцам шчасця
асветлены сам.
Найпрыгожую самую
тайну
Перакрэсліць нікому
не дам.

Прыпеў.



Ну і ну!

П'ЯНЫ БАЦЬКА ЎДАРЫЎ СЫНА НАЖОМ

Выклікам хуткай дапамогі і праваахоўных органаў завяршыўся дзень у адным з дамоў у вёсцы Карзуны Чэрвеньскага раёна. 59-гадовы мужчына вырашыў правесці выхаваўчы ўрок з 35-гадовым сынам. Аднак довады бацькі не спадабаліся спадчыннику. Як вынік — апошні дастаўлены ў бальніцу з пранікальным раненнем грудной клеткі.

Каля 20 гадзін у дзяжурную часць Чэрвеньскага РАУС паступіла паведамленне ад мясцовага жыхара пра тое, што на парозе суседскай хаты сплывае крывёй мужчына. Неадкладна на дапамогу выбылі хуткая і супрацоўнікі міліцыі.

На месцы здарэння аператыўнікі аднавілі ланцужок падзей таго вечара. Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінскага аблвыканкама, на момант канфлікту сваякі знаходзіліся ў алкагольным ап'яненні. Хутчэй за ўсё, менавіта гэты факт і паўплываў на трагічны вынік гутаркі паміж мужчынамі. Паводле папярэдніх звестак, бацька раззлаваўся на сына і ў парыве гневу нанёс удар нажом, прычыніўшы цяжкія цялесныя пашкоджанні. Пасля здзейсненага ўчынку галава сямейства пайшоў з дому, аднак у хуткім часе быў спынены аператыўнікамі.

Пацярпелы знаходзіцца ў бальніцы, яго жыццю і здароўю нічога не пагражае.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

29 МАЯ

1900 год — нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч Багалюбаў, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, генерал-палкоўнік (1945), Герой Савецкага Саюза (1945).

1915 год — нарадзіўся Іван Несцеравіч Тордыя, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Загінуў у баі каля горада Масты ў 1944-м.

1920 год — нарадзілася Вольга Іосіфаўна Соламава, адна з арганізатараў патрыятычнага падполля і партызанскага руху ў Беластоцкай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вяла агітацыйную работу сярод насельніцтва, арганізоўвала падпольныя камсамольскія групы ў партызанскіх атрадах і населеных пунктах. У складзе партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага выконвала баявыя заданні. Загінула ў баі ў 1944-м.

1970 год — адкрыты для наведвальнікаў Бялыніцкі раённы мастацкі музей імя Бялыніцкага-Бірулі.

У свеце

325 год — у візантыйскім горадзе Нікея быў скліканы Першы Сусветны сабор — з'езд найвышэйшага духавенства хрысціянскай царквы, які сфармуляваў так званы сімвал веры — кароткі выклад хрысціянскіх дагматаў, абавязковых для кожнага хрысціяніна.

1730 год — нарадзіўся мітрапаліт Гаўрыіл (у свеце Пётр Пятровіч Пятроў), рускі рэлігійны дзеяч, пісьменнік, ганаровы член Імператарскай акадэміі навук і мастацтваў у Санкт-Пецярбургу.

1835 год — нарадзіўся Аляксандр Іванавіч Марозаў, рускі мастак, перадзвіжнік, акадэмік Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Найлепшыя карціны мастака знаходзяцца ў Траццякоўскай галерэі ў Маскве.

1910 год — нарадзіўся Аляксандр Іванавіч Лакціёнаў, расійскі жывапісец і графік, народны мастак Расіі (1969), правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР (1958). Лаўрэат Сталінскай прэміі (1948), Дзяржаўнай прэміі Расіі імя І. Рэпіна (1971).

1945 год — выйшла дырэктыва Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандавання, у адпаведнасці з якой была ўтворана Група савецкіх акупацыйных войскаў у Германіі (пазней Заходняя група войскаў). Расфарміравана ў 1994-м.

Так гаварыў...

ХЕМІНГУЭЙ:
«Не мяркуйце пра чалавека толькі па ягоных сябрах. Успомніце, што сябры Іуды былі бездакорныя».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.47	21.28	16.41
Віцебск —	4.29	21.25	16.56
Магілёў —	4.37	21.18	16.41
Гомель —	4.42	21.06	16.24
Гродна —	5.04	21.41	16.37
Брэст —	5.13	21.34	16.21

Месяц

Маладзік 22 мая.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Георгія, Фёдара, Яфрэма.*
К. *Марыі, Уршулі, Аляксандра, Максіма, Пятра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Мама піша ліст сыну ў турму: «Сынок, з таго часу, як цябе пасадзілі, мне ўсё цяжэй спраўляцца па гаспадарцы. Вось цяпер трэба агарод перакапаць і бульбу пасадзіць, а дапамагчы няма каму».

Сын адпісваецца: «Мама, вы агарод не чапайце, бо такое выкапаеце, што і вас пасадзяць, і мне тэрмін дабавяць».

Мама адказвае: «Сынок, пасля твайго апошняга ліста прыходзілі міліцыянеры, увесь агарод перакапалі, нічога не знайшлі. Сышлі злыя, лаяліся».

Сын піша: «Чым змог — дапамог. Бульбу самі пасадзіце».

Цяжка сёння бацькам. Трэба пастаянна сачыць за тым, што сын спампоўвае з інтэрнэту, а дачка туды выкладвае.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы
тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1451.

Нумар падпісаны ў 19.30 28 мая 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

29 мая 2020 г. № 20 (556)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

Цудоўны «дваровы пераварот»

Фота з архіва гераіні.

Два гады таму ў Гомелі пяць маладых маці стварылі свой маленькі цуд. Вялікі няўтульны двор ператварылі ў прыгожае і бяспечнае месца адпачынку для дзяцей на радасць усім

Марына МАРЦІНОВІЧ 10 гадоў таму не ўяўляла нават, што стане кіраўніком «Праспекта цудаў». Тады будучая старшыня камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання з мужам засялілася ў шматпавярховік — забудову сярэдзіны 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Нарадзіўся старэйшы сын і маладая маці сутыкнулася з тым, што гуляць з малым ні побач з домам, ні ў суседніх дварах няма магчымасці. Нідзе не было прыстасаванняў для дзіцячых гульняў.

— У нашым двары была старая металічная «лазілка» ды дабітая не адным пакаленнем дзяцей баскетбольная пляцоўка, на якой тырчалі слупы для кольцаў.

У сям'і Марціновічаў тым часам падрастаў ужо другі сынок, а сітуацыя з гульнявымі пляцоўкамі ніяк не мянялася. Дамы вакол старыя, дзеці ўжо выраслі. Але цяпер яны выхоўваюць сваіх дзяцей самых розных узростаў. Вось на радасць гэтым маленькім жыхарам мікрараёна Рэчыцкі матулі і бацькі вырашылі стварыць цуды.

— Я даведалася пра сапраўдны дваровы пераварот у нашым мікрараёне, які здзейснілі маладыя бацькі. Аб'ядналіся, сабралі грошы, усталявалі вялікі дзіцячы гарадок і цалкам добраўпарадкавалі тэрыторыю вакол свайго дома, — успамінае Марына і кажа, што таксама вырашыла дзейнічаць. стар. 14

ІНІЦЫЯТЫВА

І Ў СЭРЦЫ, І Ў ГРАНІЦЕ

Нядаўна ў вёсцы Казелле Краснапольскага раёна, што на Магілёўшчыне, быў закладзены будучы мемарыял. Вясковец Уладзімір КОНАНАЎ з уласнай ініцыятывы, якую падтрымалі на мясцовым узроўні, паставіў за свой кошт помнік землякам, што ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Ідэя так спадабалася землякам, што яны таксама сабралі грошы і маюць намер усталяваць яшчэ і памятныя дошкі, на якіх будуць пазначаны імёны тых, хто загінуў на вайне, і тых, хто вярнуліся дадому з Перамогай.

Казелле — даволі вялікая вёска, у Краснапольскім раёне трэцяя па колькасці жыхароў — каля 250. І, як высветлілася, сярод іх шмат актывістаў і патрыётаў. Прычым даволі сціплых. Уладзімір Конанаў, калі пачуў, што ім цікавіцца журналіст, адразу ж стаў пратэставаць — маўляў, няма чым ганарыцца.

— Я проста хачу, каб была ўвекавечана памяць, — коратка растлумачыў ён свой грамадзянскі парыў. стар. 13

На фота злева направа: **Сяргей СЫРАНКОЎ, Аляксандр ТРУШКІН, Анжаліка ГОМАН, Васіль КАНАПЛЁЎ, Ганна ШПУНТАВА.**

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Драйверы росту

Якія дадатковыя меры дапамогуць падтрымаць айчынных вытворцаў у перыяд эканамічнага спаду, выкліканага пандэміяй? стар. 2

Без дробязяў

Бескантактавыя тэрмометры перададзены радзільным дамам Міншчыны. стар. 3

Стымул для актыўных

Колькі можна зарабіць на тым, каб проста добраўпарадкаваць тэрыторыю, дзе жывеш? Аказваецца, нямала. стар. 4

Незвычайнае Серафімава

Чаго могуць дасягнуць няўрымслівыя вяскоўцы, калі паверацьу рэалізацыю сваёй маленькай мары. стар. 14

Выйсці ў «Лідары»

Шматфункцыянальны фізкультурна-спартыўны цэнтр рыхтуецца да адкрыцця ў Навагрудку. стар. 16

ЦІКАВАЕ ПЫТАННЕ

ЯК ЗНАЙСЦІ ДРАЙВЕРЫ РОСТУ?

Днямі ў Савеце Рэспублікі адбылося пасяджэнне секцыі № 2 навукова-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі на тэму «Асноўныя напрамкі стабілізацыі фінансава-эканамічнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь у сучасных умовах».

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ у гутарцы з журналістамі адзначыла, што галоўная задача сённяшняга пасяджэння навукова-кансультатыўнага савета — паспрабаваць знайсці адказы на ключавыя праблемныя пытанні эканомікі, даць рэкамендацыі адносна сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на сучасным этапе. У прыватнасці, мяркуецца выпрацаваць дадатковыя меры па абароне нашага ўнутранага рынку, змякчэнні ўмоў крэдытавання ў банкаўскай сферы, падтрымцы суб'ектаў гаспадарання, якія з-за пандэміі каранавіруса трапілі ў складанае становішча. Акрамя таго, ураду прапанавана правесці маніторынг рэалізацыі палажэнняў указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прынятых у бягучым годзе, па падтрымцы эканомікі і суб'ектаў гаспадарання, адзначыла яна.

Сенатар таксама закранула пытанне актывізацыі работы мясцовых органаў улады. Ім, па словах старшыні Пастаяннай камісіі, даручана аказваць падтрымку прадпрыемствам, якія найбольш падвергліся ўплыву пандэміі.

У сваю чаргу **дырэктар Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Васіль ГУРСКІ** паведаміў, што ўжо прыняты комплекс першачарговых мер па падтрымцы беларускай эканомікі, а цяпер распрацоўваюцца дадатковыя меры па яе стымуляванні.

Ён звярнуў увагу на важны для функцыянавання эканомікі факт, што ў Беларусі не сталі на фоне пандэміі спыняць работу прадпрыемстваў і закрываць межы з суседзямі. І гэта самым спрыяльным чынам адбілася на фінансава-эканамічнай сітуацыі ў краіне. Нездарма многія замежныя аналітыкі адзначаюць, што Беларусь пацярпела ў найменшай ступені. Страты, якія яна вымушана панесла, непараўнальныя з тымі, якія сёння назіраюцца ў іншых краінах. Бо тыя закрылі свае вытворчасці, межы, а зараз спрабуюць зноў усё наладзіць, аднавіць спыненыя эканамічныя сувязі. Гэта запатрабуе велізарных дадатковых сродкаў, — адзначыў Васіль Гурскі.

Разам з тым дырэктар Інстытута эканомікі даў зразумець, што нельга супакойвацца. Ён падкрэсліў, што праблемы ёсць, і глабальныя крызісныя з'явы не могуць не адбіцца на беларускай эканоміцы. Сітуацыя ўскладняецца і з той прычыны, што Беларусь з'яўляецца краінай з адкрытай і экспартна арыентаванай эканомікай. Яна вельмі залежыць ад знешняга гандлю. У сувязі з гэтым асаблівую ўвагу трэба аддаць падтрымцы экспарту і экспартна арыентаваных прадпрыемстваў, больш настойліваму і мэтанакіраванаму прасоўванню іх прадукцыі на рынкі краін блізкага замежжа і так званай дальняй дугі, выказаў меркаванне Васіль Гурскі.

У пасяджэнні ўдзельнічалі члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі міністэрстваў эканомікі, фінансаў, па падатках і зборах, Нацыянальнага банка, Нацыянальнай акадэміі навук, эксперты, кіраўнікі бізнес-асацыяцый. Падчас размовы імі былі выказаны слушныя і канкрэтныя прапановы па супрацьдзеянні новым выклікам і пагрозам ва ўмовах глабальных змяненняў у сусветнай эканоміцы.

Напрыклад, Таццяна Рунец заклікала ў няпростай сітуацыі прапаноўваць не толькі шляхі падтрымкі прадпрыемстваў сферы паслуг, турызму, гасцінічнага бізнесу, іншых галін, якія апынуліся ў мінусе, але і шукаць драйверы росту эканомікі, каб выйсці з часам на новы ўзровень гаспадарання.

Па выніках пасяджэння прыняты рэкамендацыі, якія будуць накіраваны ўраду, дзяржаўным органам і арганізацыям.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

МАГЧЫМАСЦЬ ПАЧУЦЬ УСЁ З ПЕРШАКРЫНІЦЫ

Віцэ-спікер верхняй палаты парламента Анатоль ІСАЧАНКА правёў прамую тэлефонную лінію

Да яго звярнуліся заяўнікі з розных куткоў краіны і па розных пытаннях: ад традыцыйнай «камунальнай» тэмы да медабслугоўвання. Усіх, хто тэлефанаваў са сваімі праблемамі і просьбамі, намеснік старшыні Савета Рэспублікі ўважліва выслухаў, заяўнікі пачулі вычарпальныя адказы, а на тыя, якія патрабуюць дадатковага вывучэння праблемы, — атрымаюць у пісьмовай форме ў замацаваныя заканадаўствам тэрміны.

Камунальныя стасункі

Па традыцыі першае месца сярод званкоў адводзіцца тэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Не стала выключэннем і цяперашняя прамая лінія. Пажылая мінчанка паскардзілася Анатолю Ісачанку, што камунальнікі не выконваюць рашэнне суда, якое абавязала іх аднавіць вентыляцыйны канал у яе кватэры. Віцэ-спікер Савета Рэспублікі паабяцаў разабрацца з гэтым пытаннем.

Больш малады мінчанін, які не першы год пакутуе ад непрыемнага суседства, выступіў з прапановай заканадаўчых змен і больш жорсткага стаўлення з пункту гледжання закона ў адносінах да асацыяльных грамадзян, што атручваюць жыццё суседзям. Сапраўды, што рабіць, калі ўсе меры вычарпаныя? Існуючы алгарытм не прыносіць супакою жыхарам. Анатоль Ісачанка падзякаваў за званок і паабяцаў больш шчыльна вывучыць тэму.

Гамяльчанка патэлефанавала з пытаннем аб налічэнні «камуналкі» за дачку, якая жыве і вучыцца ў іншым горадзе. Жанчына паскардзілася, што ў інтэрнаце, дзе яна жыве, пераразлік рабіць не жадаюць. Яе пытанне патрабуе больш дэталёвага вывучэння, грунтоўны адказ на яго яна атрымае ў вызначаны заканадаўствам тэрмін.

Фота БелТА.

Дарэчы, не толькі камунальныя праблемы, але і падзякі на гэтую тэму агучваюцца пасля правядзення прамых ліній. Напрыклад, сталічныя жыхары аднаго са шматкватэрных дамоў падзякавалі Анатолю Ісачанку за дапамогу. Званок да яго зняў даўнюю праблему, якая перашкаджала жыхарам: яны скардзіліся на беспарадак у падвале. Дзякуючы садзейнічанню Савета Рэспублікі гэтае пытанне вырашана, што і пацвердзіў станоўчы водгук.

Працаўладкаванне...

Здараецца, заяўнікі звяртаюцца і па тэме садзейнічання ў пошуках рабочага месца, калі ўсе самастойныя спробы не прынеслі выніку. Так здарылася і цяпер: бухгалтар-эканаміст з Салігорска расказала, што працяглы час не можа працаўладкавацца (у тым ліку праз цэнтр занятасці насельніцтва), патэнцыйныя наймальнікі лічаць, стажу па гэтай спецыяльнасці малавата — два гады. «Для мяне гэта — як апошняя надзея», — звярнулася жанчына. Намеснік старшыні Савета Рэспублікі запэўніў заяўніцу, што яе пытаннем зоймуцца.

....і добраўпарадкаванне

Жыхарка Капыльскага раёна Міншчыны лічыць, што асфальтавая дарога да яе вёскі даўно ўжо аджыла сваё і яе трэба аднавіць. Тым больш калі ў суседняй вёсцы гэтую праблему ўжо вырашылі. Маўляў, чым мы горшыя?

Аналагічны званок прагучаў і з Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці: ваенны пенсіянер спытаў, ці магчыма пабудаваць веласцяжынку паміж некалькімі вёскамі. Усе гэтыя пытанні вывучаць больш дасканала, заяўнікі атрымаюць пісьмовыя адказы.

У інтэрв'ю журналістам віцэ-спікер верхняй палаты парламента адзначыў, што стасункі з людзьмі ў фармаце прамых тэлефонных ліній — гэта важны складнік работы сенатараў, дэпутатаў усіх узроўняў.

— Гэта магчымасць пачуць усё з першакрыніцы. Праблемы бываюць як асабістыя, так і больш маштабныя. Галоўнае — іх аналізаваць і прымаць рашэнні, — падкрэсліў ён.

Большасць зваротаў, як правіла, звязана з праблемамі сферы ЖКГ, зямельнымі і маёмаснымі пытаннямі.

— Што датычыцца нашых актуальных тэм, то пытанняў па каранавірусе сёння не паступала. У дзяржаве эфектыўна выбудавана сістэма аховы здароўя, людзі ведаюць, куды звяртацца, медыцына працуе, усё ідзе ў штатным рэжыме, — падсумаваў Анатоль Ісачанка.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Разарваць бюракратычнае кола

Учора старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў правёў прамую тэлефонную лінію.

Пераважная большасць зваротаў датычылася складаных жыццёвых сітуацый. Так, Галіна Пятроўна з Віцебскай вобласці прасіла дапамагчы ў лячэнні роднага брата, які пакутуе ад цяжкай хваробы. Былі званкі на вытворчую тэму: Дзмітрый Сямёнавіч скардзіўся на штучныя праблемы з арганізацыяй выпуску санітарна-гігіенічнай прадукцыі, якая, па яго словах, мае экспартны патэнцыял. Напрыклад, ён лічыць яе перспектыўнай для рынку Расійскай Федэрацыі. Са Старых Дарог быў званок пенсіянера аб быццам бы існуючых недахопах і хібах у дзейнасці мясцовых праваахоўных органаў.

Зразумела, кожны зварот быў зафіксаваны. У асобных выпадках Сяргей Рачкоў прасіў суразмоўцаў удакладніць выкладзеныя факты, для больш эфектыўнай работы па іх вывучэнні занатаваць сутнасць пытання на паперу і даслаць на адрас Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі. Сенатар паабяцаў, што ўсе, хто сёння патэлефанаваў, абавязкова атрымаюць абгрунтаваныя адказы.

У размове з журналістамі ён падвёў і вынікі работы Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы ўвогуле са зваротамі грамадзян. З пачатку года яе члены атрымалі 242 звароты. Іх можна ўмоўна падзяліць на 12 тэм. Вядома, людзей па-ранейшаму хвалююць пытанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі, дзейнасці міліцыі, судоў, пракуратуры, супрацоўнікаў Следчага камітэта, мясцовых уладаў і г. д. Каб дасканала разабрацца ў сітуацыі, супрацоўнікі апарату Савета Рэспублікі выязджаюць на месца.

Сяргей Рачкоў заўважыў, што здараюцца выпадкі, калі грамадзяне ў пошуку вырашэння свайго пытання трапляюць нібы ў «заганнае» кола нежадання пачуць і зразумець патрэбы чалавека. Яго па канкрэтны адказ адсылаюць ад адной службы да другой, ад раённай арганізацыі ў абласную і г. д. У выніку членам Савета Рэспублікі даводзіцца, так бы мовіць, разрываць гэта бюракратычнае кола.

Леанід ТУГАРЫН.

ЧЫСТА ТАМ, ДЗЕ НЕ СМЕЦЯЦЬ

Падчас прамой тэлефоннай лініі старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэя Бугрова мінчане ўзнялі тэму добраўпарадкавання і чысціні дваровых тэрыторый сталіцы.

Андрэй Бугроў у той дзень атрымаў амаль 30 званкоў ад гараджан. Яны задавалі розныя пытанні, закраналі і традыцыйныя праблемы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, іншыя аспекты жыцця вялікага горада. Зразумела, кожны запыт узяты на кантроль, ён будзе разгледжаны спецыялістамі гарадскіх службаў і арганізацый.

Па выніках размовы з мінчанамі ў гарадскім Савеце асаблівую ўвагу вырашылі звярнуць на ўзнятыя пытанні добраўпарадкавання праспектаў і вуліц сталіцы, чысціні дваровых тэрыторый, увогуле іх азелянення. У прыватнасці, адным заяўнікам была выказана прэтэнзія, што ў асобных дварах мала высаджваюць дрэў і дэкаратыўных кустоў.

Відаць, калі гэта так, то мы маем хутчэй справу з выключэннем. За апошнія два-тры гады ў Мінску зроблена вельмі шмат для азелянення як самімі гараджанамі, так і Мінскзелянбудам і яго раённымі структурнымі падраздзяленнямі.

На думку Андрэя Бугрова, такая «зялёная» палітыка будзе і надалей працягнута гарадскімі ўладамі. Бо ад гэтага ў многім залежыць якасць жыцця і цяперашніх мінчан, і наступных пакаленняў. А дастойнае зялёнае асяроддзе толькі спрыяе камфортнаму жыццю людзей. Невыпадкова Мінск заслужана вылучаецца сярод іншых вялікіх гарадоў планеты сваёй архітэктурай, добраўпарадкаванасцю, бяспекай і чысцінёй.

Але, як вядома, чыста там, не дзе прыбіраюць, а там, дзе не смецяць. У гэтым сэнсе своечасовы і актуальны быў званок з патрабаваннем узмацніць адказнасць за выкананне правілаў утрымання хатніх жывёл.

— Такія несур'ёзныя паводзіны асобных мінчан непакояць і дэпутатаў гарсавета. Бо кожнаму гаспадару хатняй жывёлы трэба выконваць увогуле нескладаныя санітарна-гігіенічныя нормы ўтрымання сабак і правілы іх выгулу ў горадзе. А за іх парушэнне адказваць. На мой погляд, узмацненне адказнасці тут бачыцца правільнай мерай. Дэпутаты гарсавета мяркуюць уважліва разгледзець гэтае пытанне, — гаворыць Андрэй Бугроў.

Але ў гарсавеце не збіраюцца вырашэнне праблемы зводзіць толькі да павышэння мер пакарання за невыкананне вышэйзгаданых нормаў і правілаў, складання пратаколаў участковымі, выпісвання штрафаў. Лідар дэпутацкага корпуса сталіцы лічыць, што тут можа больш актыўна праявіць сабе грамадскасць горада, іх аб'яднанні, пункты аховы правапарадку.

Леанід ТУГАРЫН.

З ПАПРАЎКАЙ НА ВЫКЛІКІ

Нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця дапрацуюць

Аб гэтым паведаміў намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па Мэтах устойлівага развіцця Анатоль ІСАЧАНКА падчас абмеркавання з пастаянным каардынатарам ААН у Беларусі Іаанай КАЗАНА-ВІШНЯВЕЦКІ і членамі краінавай каманды ААН у Беларусі пытанняў супрацоўніцтва.

Перагаворы прайшлі ў фармаце відэаканферэнцыі. Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента, былі разгледжаны вынікі ўзаемадзеяння нашай краіны і ААН па пытаннях дасягнення Мэт.

— Мы цэнім магчымасць нашага супрацоўніцтва і ўдзячныя за праекты, накіраваныя на падтрымку рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця ў Беларусі, — адзначыў Анатоль Ісачанка.

У рамках партнёрства з агенцтвамі ААН у краіне сфарміравана і эфектыўна функцыянуе нацыянальная архітэктура кіравання працэсам дасягнення Мэт устойлівага развіцця, адбыліся значныя міжнародныя і нацыянальныя мерапрыемствы. З удзелам экспертаў ААН, Савета па ўстойлівым развіцці, парламенцкай і партнёрскай груп па МУР вялася работа над праектам Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Беларусі да 2035 года.

— Яна сфарміравана, але з-за сітуацыі, якая склалася, існуючых сёння ў свеце выклікаў асобныя кірункі неабходна будзе дапрацаваць, — падкрэсліў ён.

Падчас перагавораў размова таксама ішла аб новым сумесным праекце па падтрымцы намаганняў Беларусі ў нацыяналізацыі і лакалізацыі МУР.

— Важна, што ён будзе накіраваны на вырашэнне актуальных задач: падтрымку нацыянальнай сістэмы дасягнення МУР, арганізацыю далейшай работы па зборы і апрацоўцы статыстычных даных, улічваць рэгіянальныя аспекты, — удакладніў нацыянальны каардынатар па МУР.

Іаана Казана-Вішнявецкі звярнула ўвагу на тое, што рэалізаваныя з Беларуссю сумесныя праекты з'яўляюцца ўнікальным прыкладам узаемадзеяння ў сферы падтрымкі архітэктуры па МУР на нацыянальным узроўні.

— Мы вельмі зацікаўлены ў тым, каб працягваць сумесную работу, — заявіла яна.

У сваю чаргу прадстаўнік Праграмы развіцця ААН у Беларусі Аляксандра Салаўёва дадала, што новы праект, які плануецца запусціць з нашай краінай, «дазваляе адказваць на патрэбы, якія ўзніклі ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй».

— ПРААН прыцягвае дадатковыя сродкі на барацьбу з пандэміяй, працуе з шэрагам міністэрстваў Беларусі. Прымаюцца меры па рэагаванні на сацыяльна-эканамічныя наступствы эпідэміялагічнай сітуацыі, прыцягненні новых тэхналогій, развіцці валанцёрскага руху, узаемадзеянні з Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа, нашымі партнёрамі, у тым ліку з Расіі, — падкрэсліла яна.

У цэлым Аляксандра Салаўёва канстатавала, што вынікі па дасягненні МУР у Беларусі адчувальныя і значныя, яны пазітыўна ацэньваюцца міжнароднай супольнасцю.

У ТЭМУ

Вопыт і ўзаемадзеянне

Пяць раёнаў Гродзенскай вобласці — Ваўкавыскі, Зэльвенскі, Свіслацкі, Слонімскі і Шчучынскі — сфарміруюць партнёрскую групу па ўстойлівым развіцці.

Асноўная мэта такога аб'яднання — кансалідацыя рэсурснага, эканамічнага і кадравага патэнцыялу пяці раёнаў вобласці для вырашэння найбольш актуальных задач рэгіянальнага развіцця.

— Ужо цяпер раёны – дэкларанты партнёрскай групы праводзяць сумесныя мерапрыемствы па развіцці аграэкатурызму, культурным абмене. Наладжаны партнёрскія сувязі паміж дзяржаўнымі структурамі, грамадскімі арганізацыямі, рэлігійнымі суполкамі. Стварэнне партнёрскай групы дазволіць арганізаваць гэтую работу на сістэмным узроўні з улікам ужо наяўнага беларускага і замежнага вопыту, — паведаміў **старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Валянцін СЕМЯНЯКА.**

Ён дадаў, што ініцыятыва знайшла падтрымку ў кіраўніцтва Гродзенскай вобласці і раёнаў патэнцыйных удзельнікаў праекта. Ёсць разуменне і экспертнае суправаджэнне з боку Праграмы падтрымкі Беларусі Федэральнага ўрада Германіі.

Па ініцыятыве парламентарыя ў рэжыме анлайн-канферэнцыі прайшоў арганізацыйны семінар па фарміраванні ўмоў для сеткавага рэгіянальнага партнёрства пяці раёнаў Гродзеншчыны. Удзельнікі абмеркавалі вопыт рэгіянальнага ўзаемадзеяння Беларусі і замежных краін, вывучылі патэнцыйныя магчымасці сеткавых рэгіянальных аб'яднанняў і шляхі іх выкарыстання для ўстойлівага развіцця пяці раёнаў Гродзенскай вобласці.

Іх прадстаўнікі прэзентавалі сваё бачанне сеткавага ўзаемадзеяння.

— Мы вызначылі асноўныя канцэптуальныя падыходы па фарміраванні рэгіянальнай партнёрскай групы. На разгляд прадстаўнікоў Ваўкавыскага, Зэльвенскага, Свіслацкага, Слонімскага, Шчучынскага раёнаў вынесена дарожная карта на 2020 год па фарміраванні групы, — адзначыў дэпутат.

У семінары таксама ўзялі ўдзел прадстаўнікі рэгіянальнага савета шасці раёнаў Магілёўскай вобласці. Паводле слоў парламентарыя, іх практыка па распрацоўцы і рэалізацыі сумесных праектаў, ініцыятыў для павышэння ўстойлівасці іх развіцця ўяўляе асаблівую цікавасць.

У Беларусі працягваецца работа па рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця. Для паляпшэння эфектыўнасці гэтай работы ў Гродзенскай вобласці распрацаваны праект стратэгіі яе ўстойлівага развіцця. Рыхтуюцца лакальныя стратэгічныя планы гарадоў, раёнаў і мікрарэгіёнаў вобласці.

Паводле БелТА.

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

УВАГА НАВАТ ДА ДРОБЯЗЯЎ

Бескантактавыя тэрмометры для пацыентаў і медработнікаў

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па Мэтах устойлівага развіцця Анатоль Ісачанка сумесна з пастаянным каардынатарам ААН у Беларусі Іаанай Казана-Вішнявецкі і кіраўнікамі агенцтваў ААН перадалі радзільным дамам Міншчыны партыю бескантактавых тэрмометраў.

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента, перадача прайшла на базе Клінічнага радзільнага дома Мінскай вобласці.

— Адным з галоўных прынцыпаў рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця з'яўляецца партнёрства. Разам з краінавай камандай ААН мы вырашылі садзейнічаць у прадухіленні распаўсюджвання COVID-19, — адзначыў Анатоль Ісачанка. — Частка сродкаў па праектах, якія прадугледжваюць рэалізацыю МУР, накіравалі на закупку бескантактавых тэрмометраў. Такім чынам мы рады аказаць дапамогу і зрабіць свой унёсак у агульную справу.

> Агульная сума сродкаў, прыцягнутых агенцтвамі ААН на падтрымку медыкаў і медыцынскіх устаноў Беларусі, складае каля пяці мільёнаў долараў.

Па словах віцэ-спікера Савета Рэспублікі, такія ж акцыі ў найбліжэйшыя дні пройдуць па ўсёй краіне. Тэрмометры перададуць дамам-інтэрнатам для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

У сваю чаргу Іаана Казана-Вішнявецкі адзначыла, што агульная сума сродкаў, прыцягнутых агенцтвамі ААН на падтрымку медыкаў і медыцынскіх устаноў Беларусі, складае каля пяці мільёнаў долараў.

— Прыкладна мільён мы перанакіравалі ў межах бягучых праектаў на такія патрэбы. Яшчэ чатыры мільёны — гэта новыя грошы, якія паступаюць у Беларусь праз САА3, ЮНІСЕФ, ПРААН, Фонд у галіне народанасельніцтва, Міжнародную арганізацыю па міграцыі.

Да нас далучаюцца новыя донары і партнёры з прыватнага сектара, — паведаміла яна.

Галоўны ўрач клінічнага радзільнага дома Мінскай вобласці Пётр Масько падзякаваў за аказаную дапамогу: «Любая падтрымка сёння важная. Хачу сказаць, што ў цяперашняй эпідэміялагічнай сітуацыі дробязяў не бывае. Бяспека кантактаў, лячэння, знаходжання ў лячэбнай установе залежыць ад дакладнага выканання рэгламенту. Вымярэнне тэмпературы з дапамогай бескантактавых тэрмометраў — гэта яшчэ адна ступень абароны і нашых пацыентаў, і нашага персаналу.

Пальчаткі, маскі, касцюмы

Парламентарыі Брэстчыны рэгулярна перадаюць сродкі індывідуальнай аховы медыцынскім і сацыяльным установам вобласці

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ад Брэсцкай вобласці рэгулярна праводзяць акцыі ў падтрымку медыкаў, работнікаў сацыяльных устаноў, якія аказаліся на першай лініі барацьбы з каварнай інфекцыяй. Шмат сродкаў аховы народныя выбраннікі набываюць у тым ліку за свой кошт. Яшчэ амаль месяц таму Ігар ХЛАБУКІН, дэпутат па Баранавіцкай-Заходняй акрузе разам з дэпутатамі Баранавіцкага гарадскога Савета перадалі галоўнаму ўрачу Баранавіцкай дзіцячай бальніцы сродкі індывідуальнай аховы — некалькі ўпаковак масак і 40 літраў сродкаў для дэзынфекцыі.

У маі ў Брэсцкую дзіцячую бальніцу прыйшлі дэпутаты ад Брэста Анатоль ДАШКО і Марына ВАСЬКО, каб перадаць набытыя за свой кошт касцюмы для медыкаў, маскі і дэзсродкі. А ў маштабнай акцыі, якую арганізавала дэпутат па Белавежскай акрузе Жанна СТАЦІЎКА, удзел узялі ўсе шаснаццаць парламентарыяў ад Брэстчыны. Дапамога была аказана Кобрынскаму псіханеўралагічнаму дому-інтэрнату. Ва ўстанову даставілі вельмі патрэбныя для персаналу сродкі індывідуальнай аховы.

Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

На першым плане — Марына ВАСЬКО і Анатоль ДАШКО.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

ВЯСНОВЫ МАРАФЕТ

Летась у Прыдзвінскім краі на навядзенне парадку на зямлі ў глыбінцы і на добраўпарадкаванне выдаткавалі каля 31 мільёна рублёў.

У тым ліку больш за 17,2 мільёна рублёў — з абласной казны, бюджэтаў базавага ўзроўню — каля 7,6, пярвічнага ўзроўню — 3,4 мільёна. Арганізацыі і прадпрыемствы не пашкадавалі на прыгажосць больш за 2,6 мільёна рублёў.

У год юбілею вызвалення Беларусі значныя сродкі — 882,5 тысячы рублёў — з мясцовых бюджэтаў выдаткавалі на добраўпарадкаванне мемарыяльных комплексаў, месцаў баявой і воінскай славы, пахаванняў вайскоўцаў і партызан.

Паводле слоў **старшыні Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віктара ГАЛАНАВА**, дзякуючы сельскім выканкамам, шэфскай дапамозе, актыўнай дзейнасці старэйшын вёсак і тых, хто выконваў работы па добраўпарадкаванні, усё задуманае рэалізавалі.

Асаблівая ўвага аддавалася Браслаўскаму раёну ў рамках падрыхтоўкі аб'ектаў да абласнога фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2019». Сёлета гэта свята пройдзе ў Віцебску, таму ў абласным цэнтры і наваколлях плённа працуюць, каб было прыгожа.

І ў Аршанскім раёне, дзе, як вядома, актыўна ажыццяўляецца «перазагрузка», паранейшаму пытанне навядзення чысціні на асаблівым кантролі не толькі мясцовай улады.

У рамках выканання абласной праграмы паскарэння развіцця гарадскіх пасёлкаў больш прывабна сталі выглядаць Бягомль — Докшыцкага і Багушэўск — Сенненскага раёнаў. Да добраўпарадкавання дадаткова прыцягваліся грамадзяне, якія на ўліку ў цэнтрах занятасці.

Паспяхова працягваецца работа па ўцягванні ў гаспадарчы абарот зямель. Летась — каля 470 гектараў, якія раней былі дадзены грамадзянам для вядзення асабістай дапаможнай гаспадаркі. Адпаведны план выкананы на 130 %. А заданне па раскарчоўцы шматгадовых насаджэнняў, драўнінна-хмызняковай расліннасці выканана на 183 %. Гэта праведзена на тэрыторыі больш чым 216,5 гектара.

КУП «Віцебскаблдарбуд» адрамантавала і прывяло ў парадак усе аўтобусныя прыпынкі — больш за 1000 і прылеглыя да іх тэрыторыі.

Шмат чаго зрабілі на грамадзянскіх могілках. Напрыклад, там з'явіліся 233 кантэйнеры для збору смецця, усталявалі або прывялі ў парадак больш за 260 агароджаў, абрэзалі і зрэзалі прыблізна 2,9 тысячы сухіх і небяспечных дрэў.

Уладкавалі 80 месцаў адпачынку каля азёр і рэк, больш за 600 дзіцячых пляцовак для гульні. У сельскіх населеных пунктах высадзілі 34,6 тысячы дрэў і каля 15,6 тысячы кустоў, а плошча новых газонаў набліжаецца да 50 гектараў. У вёсках і вёсачках, як падлічылі дзяржаўныя эколагі, работы правялі на 2724 калодзежах і воданапорных калонках, амаль 400 зонах санітарнай аховы артэзіянскіх свідравін.

Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ канстатаваў, што трылогія «Года малой радзімы» паспрыяла актывізацыі ў навядзенні парадку. І самазаспакойвацца нельга, бо ў яе завяршэнне неабходна яшчэ зрабіць нямала. У тым ліку і ў дробязях. І недастаткова навесці прыгажосць. Яе трэба падтрымліваць і сачыць за парадкам штодня, не запускаць тое, што зрабілі. Не ва ўсіх яшчэ населеных пунктах гэта пытанне на якасным узроўні. Неабходны сістэмны падыход і каб не было фактаў безгаспадарнасці. Добра, што ўсё больш энтузіястаў, якія за свае грошы або, як спрадвеку прынята ў Беларусі — талакой, «наводзяць марафет» і больш маштабныя змены робяць на асобных вулачках, скверах, каля вадаёмаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СТЫМУЛ ДЛЯ АКТЫЎНЫХ

Карэспандэнт «МС» высвятляла, на якія мэты ідуць прэміі Магілёўскага аблсавета за перамогу ў спаборніцтвах сярод органаў мясцовага самакіравання

Знамянальна, што сёлета Кіраўскі раён зноў на лідарскіх пазіцыях. Праўда, летась перамогу святкаваў Добасненскі сельсавет, а гэтым разам — Скрыпліцкі. Разам з пераходзячым сцягам аблсавета дэпутатаў ён атрымаў 500 базавых велічынь. Па 400 і 300 базавых адпаведна ўручылі старшыням Семукацкага сельсавета, што ў Магілёўскім раёне, і Міхееўскага, што ў Дрыбінскім. Добрая падтрымка для руплівых гаспадароў!

Перамога — справа агульная

Старшыня Скрыпліцкага сельсавета Жанна РЫШКЕВІЧ прызнаецца, што мінулы год быў вельмі прадукцыйны. А ўлічваючы, што і ў іншых раёнах працавалі з не меншым імпэтам, было асабліва прыемна трапіць у лідары. Жанна Міхайлаўна адзначае, што перамога — гэта агульная заслуга, адзнака работы не толькі сельсавета, а ўсёй раённай улады, суб'ектаў гаспадарання і, вядома, насельніцтва. Вельмі дапамаглі сельгасарганізацыя «Ніва-Барсукі», якую ўзначальвае Іван Рыняк, і «Барчыцы-Агра» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Ядчанкі. З іх удзелам былі праведзены вялікія работы па добраўпарадкаванні населеных пунктаў, зносе 28 старых дамоў і ўцягванні зямель у гаспадарчую дзейнасць. Барчыцкі ВПК «Дзіцячы сад — сярэдняя школа», якім кіруе Святлана Акуліч, дапамог залажыць аж тры паркі ў аграгарадках Скрыпліца, Барчыцы і вёсцы Капусціна. Удзельнічалі і дзеці, і дарослыя. Настаўніца школы і дэпутат сельсавета Алена Трушкіна праводзіла інфармацыйную работу з насельніцтвам, заклікала наводзіць парадак на падворках. Актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні заўсёды бярэ скрыпліцкі яслі-сад, які ўзначальвае Марына Чыкулаева.

Не засталося ўбаку аддзяленне кругласутачнага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў, якое знаходзіцца ў вёсцы Хвайніца. Дырэктар установы Анатоль Рышкевіч і яго калектыў дапамаглі наводзіць парадак у тамтэйшым парку. З удзелам старэйшыны вёскі Кацярыны Будніцкай высаджвалі клёны і бярозкі на месцы знесенага дома.

Жыхары Скрыпліцы, Барчыц, Капусціна, Глыбокавіч сабралі шмат грошай — каля чатырох тысяч рублёў — на агароджы і спілоўку аварыйных дрэў. Пад'ём энтузіязму назіраўся сярод жыхароў вёскі Капусціна: калі сельсавет пачаў мяняць агароджу ўздоўж вуліцы, людзі самі без спецыяльнага запрашэння далучыліся да справы — адны рамантавалі і фарбавалі свае старыя платы, другія ставілі новыя.

Барацьба з пажарамі і крадзяжамі

Пры падвядзенні вынікаў дзейнасці сельсавета заўсёды ўлічваецца паказчык па прафілактыцы правапарушэнняў. Дык вось па Скрыпліцы летась іх стала менш на чатыры. Жанна Рышкевіч лічыць, што гэта вынік работы грамадскага пункта аховы правапарадку, які дзейнічае на базе сельвыканкама. Гэта цяпер каранавірус перашкаджае праводзіць пасяджэнні, а летась яны адбываліся як мінімум раз на месяц. Прапрацоўвалі нядобранадзейных грамадзян, схільных да злачынстваў, прычым не фармальна. Напрыклад, сельсавет разам з участковым распрацаваў памяткі, як захаваць сваю маёмасць ад крадзяжоў, і распаўсюдзіў іх праз пошту і сацыяльную службу сярод пажылых людзей — яны часцей за ўсё становяцца ахвярамі. Пазалетась былі праблемы з гвалтам у сем'ях. Тлумачальная работа, здаецца, дапамагла: летась такіх злачынстваў наогул не было. Аналагічна працавалі над прадухіленнем пажараў. Летась быў толькі адзін — згарэла гаспадарчая пабудова. І назіральная камісія — а яна ў раёне апошнія чатыры гады ўваходзіць у тройку лідараў — цяпер больш дэталёва аглядае электраправодку і стан не толькі дамоў, але і гаспадарчых пабудоў і лазняў.

— Мы шчыльна папрацавалі і па добраўпарадкаванні, і па прафілактыцы, і па пасадцы новых насаджэнняў, — пералічвае Жанна Рышкевіч. — Раней эколагі папікалі, што мы добра зносім дрэвы і нічога не саджаем наўзамен. Летась мы пасадзілі каля 300 дрэў — у парках, на ўчастках, дзе раней стаялі пустыя дамы. Работа вялікая, і на ўсё патрэбны грошы. І дапамога ў выглядзе 500 базавых, якую мы атрымалі, вельмі дарэчы. Мы набылі бензакосы, новую бензапілу, прычэп да аўтамабіля, купілі аргтэхніку і камп'ютар. Гэта дапаможа зрабіць работу сельсавета больш мабільнай. Мы працуем з сістэмай ЛАІС (лакальная аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма. — **«МС».**) органаў мясцовага кіравання і самакіравання першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню, робім шмат аперацый, якія звязаны з рэспубліканскай базай. Стары камп'ютар ужо не цягнуў той аб'ём інфармацыі, які нам патрэбны. І цяпер гэта праблема вырашана.

Грошы на развіццё

Дыплом II ступені і ўзнагароду ў памеры 400 базавых велічынь атрымаў **Семукацкі сельсавет Магілёўскага раёна пад старшынствам Тамары УКРУЖСКАЙ**. Мы ўжо неаднаразова пісалі, як актыўна працуе тут насельніцтва пад кіраўніцтвам няўрымслівай старшыні. Тамара Пятроўна кажа, што на пачатку 2019 года яна настройвала людзей на перамогу: казала, што, калі плённа папрацаваць, можна будзе атрымаць адчувальную дапамогу. Жыхары яе падтрымалі — і мэта дасягнутая. За прэмію ўжо куплены дзве каруселі для аграгарадкоў Семукачы і Вялікія Бялевічы, набытыя прыгожыя кветачніцы і шмат іншых неабходных рэчаў, на якія раней не было грошай.

Па-гаспадарску распараджаюся прэміяй **Віктар ЖУК,** які ўзначальвае **Міхееўскі сельсавет дэпутатаў Дрыбінскага раёна**. Менавіта гэтаму сельсавету дасталіся трэцяе месца і ўзнагарода ў памеры 300 базавых велічынь.

— На абласным узроўні сельсавет падняўся на такую высокую прыступку ўпершыню, хоць на раённым заўсёды быў калі не ў лідарах, то ў прызёрах дакладна, — кажа Віктар Рыгоравіч. — Гэтым разам пашчасціла двойчы: першае месца на раёне і трэцяе на вобласці. Грошы вельмі спатрэбяцца для вырашэння пытанняў па добраўпарадкаванні і ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы. У планах — закупіць дадаткова пажарныя апавяшчальнікі і сілкаванне для іх, каб потым прапанаваць насельніцтву для падмены. І трэба будзе заахвоціць назіральную камісію за добрую прафілактычную работу.

У асабістым заліку

Сярод органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання дыплом I ступені, пераходзячы вымпел і ўзнагароду ў памеры 50 базавых велічынь атрымала **старшыня мікразоны № 2 «Савецкая» з Крычава Валянціна БАЧКОВА**. Дарэчы, мікразона два гады таму заняла ў абласных спаборніцтвах другое месца.

— У нас быў вопыт, і мы працавалі на перамогу, — кажа Валянціна Мікалаеўна. — Летась мы вельмі шмат чаго зрабілі. Добраўпарадкавалі дзіцячы сквер па вуліцы Савецкай, саджалі кветнікі, праводзілі суботнікі, мянялі агароджу, арганізоўвалі святы двара. Натуральна, усё гэта з дапамогай раённай улады, у прыватнасці, райсавета дэпутатаў.

У планах на гэты год — працягнуць работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі мікразоны, правесці касметычны рамонт дзіцячай пляцоўкі, зрабіць інфармацыйныя матэрыялы, арганізаваць для дзяцей летнія мерапрыемствы. І ўзнагарода за леташнія вынікі вельмі дапаможа зрабіць гэта больш якасна і хутка.

Староста вёскі Усполле Ходасаўскага сельсавета Мсціслаўскага раёна Лідзія ІЛЬЯНАВА, якая атрымала 40 базавых велічынь за другое месца ў спаборніцтвах, паведаміла, што пэўная сума пойдзе на набыццё бензапілы для сельсавета, яшчэ частку грошай плануецца пусціць на выраб металічнай альтанкі ў вясковым парку.

— Гэта вельмі прыгожае месца, і там часта гуляюць дзеці — будзем ствараць для іх умовы, — расказала Лідзія Нічыпараўна. — Нашы жыхары заўсёды з задавальненнем удзельнічаюць у добрых справах, не шкадуюць грошай на добраўпарадкаванне вёскі. Цяпер вось акультурваем мясцовую крыніцу.

Дыплом III ступені і 30 базавых велічынь атрымаў за актыўную работу **старэйшына дома № 12 па вуліцы Савецкай у Кіраўску Віктар КАЛЯСНЁЎ**. Дарэчы, Віктар Рыгоравіч на гэтай пасадзе ўжо 10 гадоў. Згадвае, што калі на сходзе выбіралі старэйшыну, ніхто не жадаў браць на сябе такую адказнасць. А вось ён сам сябе вылучыў — пры ўмове, што яго будуць слухацца. І жыхары робяць гэта. У доме 60 кватэр, і амаль у кожнай гатовы падтрымаць свайго клапатлівага лідара. Летась, напрыклад, сабралі грошы і пафарбавалі ў пад'ездах вокны і падаконнікі, адрамантавалі ў двары лаўкі, зрабілі з дапамогай райвыканкама дзіцячую пляцоўку. Цяпер сабралі грошы, каб павялічыць прыдамавую аўтапаркоўку. А вось за прызавы фонд Віктар Рыгоравіч прапануе адрамантаваць сцены ў першым і пятым пад'ездах — яны патрабуюць абнаўлення.

За палову крока ад перамогі былі Падсолтаўскі сельскі Савет дэпутатаў Мсціслаўскага раёна (старшыня — Аксана Лісоўская), а таксама староста вёсак Канцы і Малінаўка Бацвінаўскага сельсавета Крычаўскага раёна Галіна Краснова і староста аграгарадка Андраны Ракшынскага сельсавета Мсціслаўскага раёна Дзмітрый Новік. Іх работу па выкананні летась паказчыкаў і ўмоў спаборніцтва сярод органаў мясцовага самакіравання адзначылі падзячнымі лістамі Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў. Гэта таксама стымул, каб выйсці ў лідары.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Скрыпліцкага сельсавета.

Тэлесеткі

Для дзяцей і пра іх

У Міжнародны дзень абароны дзяцей, які адзначаецца 1 чэрвеня з 1950 года, сацыякультурны канал Белтэлерадыёкампаніі падрыхтаваў тэматычную праграму: мультфільмы і мастацкае кіно, а таксама праекты ўласнай вытворчасці, у тым ліку для самых маленькіх.

Так, у святочны дзень гледачоў чакаюць спецыяльныя выпускі праграм «Дабраранак» і «Калыханка». Адбудуцца паказы мультфільмаў і мастацкіх кінастужак.

У 14.30 творчая група «Наперад у мінулае» адправіцца ў фальклорную экспедыцыю ў вёску Дзяржынск Лельчыцкага раёна, каб паназіраць за абрадам «Жаніцьба коміна» ў выкананні калектыву «Пралеска». Вынік вандроўкі — новая арыгінальная версія народнай песні, якую выканае Тэатр эстраднай песні «Хвілінка».

У 16.50 на тэлеканале пачнецца музычная праграма для дзяцей «Класіка — гэта класна!». Яна распачне цыкл забаўляльна-адукацыйных праграм, на якіх юныя слухачы далучаюцца да класічнай музыкі, яе таямніц, сэнсаў і нюансаў.

У 20.00 гераіняй фільма-партрэта пра таленавітую беларускую моладзь з цыкла «На вышыні» стане маладая мастачка Настасся Чачура.

На завяршэнне святочнага дня сацыякультурны канал пакажа балет «Шлях да мары» ў выкананні навучэнцаў і выпускнікоў Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа.

На хвалі

КАНЦЭРТ НОВЫХ «МАЛАДЫХ ТАЛЕНТАЎ БЕЛАРУСІ»

30 і 31 мая на хвалях Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё можна будзе пачуць выступленні і інтэрв'ю пераможцаў і журы IX Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі».

Так, у аднайменнай праграме Першага нацыянальнага юныя «зорачкі» музычнага спаборніцтва (яно сёлета прысвечана 75-годдзю Вялікай Перамогі) будуць праводзіць вясну пад акампанемент сваіх песень і інструментальных кампазіцый. А аўтар і вядучая праекта Таццяна Якушава раскажа, якія ўражанні пакінуў конкурс, і ў двух радыёканцэртах прадставіць самых яркіх удзельнікаў, хто здабыў сёлета ўзнагароды і дыпломы па ацэнках аўтарытэтнага журы.

Яшчэ адзін прыклад — праспект у цэнтральнай частцы Брэста, дзе ўвесь час здараюцца аварыі. Каб зменшыць іх колькасць, ДАІ прапануе паставіць турнікетныя агароджы, закрыць пешаходныя пераходы, што вядуць ад прыпынку да царквы, і зрабіць дадатковую палосу павароту за кошт зялёнай зоны. Такім чынам, з аднаго боку, ДАІ вырашае важную задачу бяспекі, а з другога — пагаршаецца пешаходная даступнасць цэнтра горада і памяншаецца азеляненне тэрыторыі. Даводзіцца шукаць кампраміс, зыходзячы з прыярытэтаў улады і сістэм жыццезабеспячэння горада.

— У гарвыканкаме была створана рабочая група са спецыялістаў розных кірункаў: водазабеспячэння, гарадской мабільнасці, энергіі і клімату, адходаў, ландшафту. Кожная група выдала свае прапановы. Многія рэчы былі занадта рэвалюцыйныя, і горадабудаўнікі не адважыліся агучыць іх у генплане. Аднак яны засталіся ў стратэгіі на будучыню, — дадаў спецыяліст.

Рэцэпт гарадскога аблічча

Каб мець добрую транспартную даступнасць загараднай забудовы, прапануецца сістэма гарадской мабільнасці з транспартна-перасадачнымі вузламі. Магчыма таксама рэалізацыя ідэі зялёнага каркаса горада, каб паркі развіваліся не ізалявана, а як частка цэлага.

— У горадзе існуюць тры колы, адно з якіх, малое, мае веласцежкі і месцы для прабежак, знаходзіцца ў цэнтральнай частцы (набярэжная, гарадскі сад, бульвар Касманаўтаў, крэпасць, парк, вуліца Міцкевіча). Сярэдняе складаецца з фартоў і фрагментаў фартыфікацыі, якія разглядаюцца як патэнцыйныя паркі і рэкрэацыйныя зоны ў жылых раёнах, — расказаў Мікалай Уласюк. — Трэцяе кола, знешняе, што ідзе вакол Паўночнага абходу Брэста, фактычна трэба проста захаваць. Праз колы праходзіць водна-зялёны дыяметр ракі Мухавец, якая яднае гэтыя зялёныя калідоры.

Брэндам горада можа стаць ідэя «Брэст — зялёныя вароты ў Беларусь» або «Брэст — паўднёвая сталіца Беларусі». Горад знаходзіцца ў шостай зоне, як Адэса, Кракаў, Прага, і гэты патэнцыял можна і трэба выкарыстоўваць.

— Ужо высаджаны алеі платанаў, цюльпанавых дрэў. На набярэжнай насадзілі каля сотні магнолій. А сярод хвойных выбіралі пароды з доўгімі іголкамі, каб стварыць уражанне, што ты ў Сочы, — пажартаваў архітэктар. — Многія рэцэпты вельмі падобныя для ўсіх савецкіх гарадоў. Аднак важна не забывацца на іх дух.

Пачалі праектаваць новыя дэталёвыя планы жылых раёнаў. У тэорыі застаецца пакуль ідэя стварэння новага жылога модуля, план якога быў распрацаваны яшчэ ў 2012-м. Аднак урбаністы не трацяць надзею на яе рэалізацыю.

— Гэта нешта накшталт сістэмы ўзамен мікрараёнаў. Тут квартальная забудова прадстаўлена разам з сацыяльнай структурай. Дамы-пяціпавярховікі — пераважна з падземнымі стаянкамі. Сістэму энергаэфектыўнага жылога модуля мы таксама трымаем у галаве. Гэта цэлы квартал, а то і раён з арыентацыяй дамоў па баках свету, аднаўляльнымі крыніцамі энергіі, экатранспартам, — падзяліўся планамі архітэктар. — Цяпер мы працуем над грамадскімі прасторамі. Удвая павялічылі Набярэжную. Вуліца Пушкінская стане пешаходнай. На месцы былога аўтавакзала хочам стварыць грамадскую тэрыторыю.

Ірына СІДАРОК,
фота аўтара.

І Ў СЭРЦЫ, І Ў ГРАНІЦЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У Уладзіміра Конанава ваявалі абодва дзяды. Дзмітрый Фаміч Конанаў загінуў на Ленінградскім фронце, а вось Маісей Фаміч вярнуўся ў вёску. І ўнук з удзячнасцю згадвае яго жыццёвыя ўрокі.

— Уладзіміра Конанава падтрымаў у яго памкненнях старэйшына вёскі Васіль Канаплёў, а за ім і я, — паведаміла **старшыня Мхініцкага сельсавета Ганна ШПУНТАВА.** — Сталі думаць, дзе ўзяць сродкі. Старэйшына кінуў кліч аднавяскоўцам, каб далучыліся. На многае, дарэчы, не разлічвалі. Натхняла тое, што Конанаў першапачаткова браўся паставіць помнік за свае грошы. Але нечакана людзі вельмі актыўна падтрымалі праект, сабралі каля 800 рублёў. І тады Конанаў узяў на сябе выдаткі па ўстаноўцы помніка, а за сродкі жыхароў вырашана зрабіць таблічкі з імёнамі франтавікоў. Спачатку думалі адзначыць толькі тых, хто загінуў, а потым вырашылі, што гэта будзе несправядліва. Чатыры чырвонаармейцы вярнуліся дадому і жылі ў вёсцы. Цяпер іх ужо няма, але ж памяць павінна застацца. Пакуль займаемся пошукамі імёнаў, каб ні пра каго з франтавікоў не забыцца. Відавочцаў тых часоў не засталося, а ў сённяшніх жыхароў інфармацыі не хапае. Вывучылі кнігу «Памяць» Краснапольскага раёна, звярнуліся ў ваенкамат, дзе паднялі архівы і правялі аналіз пахавальных. Ужо вядома 69 прозвішчаў, але работа яшчэ не скончана.

Удзячныя жыхары вёскі Казелле.

Асноўны помнік адкрылі ў Дзень Перамогі з удзелам прадстаўнікоў раённай ўлады на чале са **старшынёй Краснапольскага райвыканкама Аляксандрам ТРУШКІНЫМ.** Удзел у мерапрыемстве прынялі **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Сяргей СЫРАНКОЎ, старшыня Краснапольскага раённага Савета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН,** дэпутаты раённага і сельскага Саветаў. Яны адзначылі, як важна сёння захоўваць памяць аб тых, хто стаў прыкладам мужнасці, стойкасці і адданасці сваёй Радзіме. Шчырыя словы падзякі былі адрасаваныя жыхарам вёскі, яе старэйшыну — Васілю Канаплёву, а таксама ініцыятару Уладзіміру Конанаву. Сельсавет адзначыў іх абодвух падзякамі.

Месца для помніка, дарэчы, было абрана таксама невыпадкова. Гэта, лічы, цэнтр вёскі, побач знаходзіцца школа. Моладзь павінна ведаць тых, кім яны могуць ганарыцца. Уладзімір Конанаў паклапаціўся, каб на адваротным баку помніка былі напісаныя словы да маладога пакалення. Каб яны не забывалі пра подзвіг сваіх продкаў і заставаліся адданыя сваёй малой і вялікай радзіме.

Установўка помніка натхніла насельніцтва, і цяпер яно прымае актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні вёскі. За частку грошай, што сабралі жыхары, вырашылі набыць туі для ўпрыгожвання памятных мясцін. Раённая арганізацыя рэспубліканскага аб'яднання «Белая Русь» таксама прафінансавала набыццё 10 туй. Частку дрэўцаў старэйшына Васіль Канаплёў з актывістамі пасадзілі побач з інфармацыйнымі стэндамі. Яшчэ некалькі туй — на месцы двух знесеных дамоў на вуліцы Цэнтральнай. Там нядаўна быў устаноўлены вялікі камень — ёсць задумка зрабіць на ім малюнак, звязаны з жыццём вёскі або з гісторыі яе стварэння.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Мхініцкага сельсавета.

Цудоўны «дваровы пераварот»

Сабралі 3,5 тысячы рублёў

Яна шукала аднадумцаў сярод суседак — маладых маці, з якімі раней разам абмяркоўвалі, дзе пагуляць з дзецьмі. Жанчыны аб'ядналіся ў ініцыятыўную групу.

— Мы разумелі, што здаваць грошы немаведама каму людзі ў нашым двары будуць баяцца. Мяне і іншых дзяўчат ведалі толькі ў нашых пад'ездах, а ў дамах нашага двара 600 кватэр. Таму звярнуліся ў камунальную арганізацыю раёна, расказалі, што будзем займацца добраўпарадкаваннем свайго двара, але неабходна правесці сход для жыхароў і афіцыйна прадставіць нашу ініцыятыву. Гэта дапамагло. Калі мы з дзяўчатамі потым абыходзілі кватэры і расказавалі, на што збіраем грошы, што будзем купляць, не было непаразуменняў. Аднак рэгістрацыю ў пашпарце даводзілася паказваць.

Як адзначае Марына, гэта быў этап, на якім многія астываюць, бо абысці ўсе кватэры, пагаварыць з людзьмі — сапраўднае выпрабаванне:

— Была вызначана сума — 40 рублёў. Прапанавалі сем'ям з малымі дзецьмі здаць грошы за два разы. Тым, у каго няма дзяцей, пенсіянерам, адзінокім людзям прапанавалі здаць любую суму, якую яны лічылі неабходнай.

Расклеілі ўлёткі, пайшлі па кватэрах і — заразілі сваім энтузіязмам суседзяў. Цуд адбыўся! На першым этапе сабралі 3,5 тысячы рублёў. Але высветлілася, што сабраць грошы на гульнявое абсталяванне — гэта палова справы. Усталяваць яго, прывезці пясок, збольшага адрамантаваць старыя дарожкі ўздоўж двара — усё гэта дапамаглі зрабіць камунальныя службы.

Дэпутацкая падтрымка

Як толькі інфармацыя аб добраахвотніцкім руху распаўсюдзілася, на дапамогу прыйшлі дэпутаты гарсавета. Шэфства над дваром узялі прадпрыемствы «Медпласт» і «Гомельскі ДСК». КЖРЭУП «Савецкае» прафесійна распланавала тэрыторыю. Работы выконвалі супрацоўнікі РЭУ-6.

— Галоўнае было — пачаць, — кажа Марына, цяпер мама трох дзетак. — Калі я распачала сур'ёзны добраахвотніцкі рух, далучыла людзей, якія хацелі дапамагчы, здаваць грошы на добраўпарадкаванне тэрыторыі, сама даведалася, што чакаю трэцяе дзіця. Адступаць было нельга. Мусіла арганізоўваць работу, сустракацца з дэпутатамі-шэфамі, якія маглі дапамагчы. Потым некаторыя нават жартавалі, што мой цяжарны жывоцік для многіх быў як месендж — адмаўляць нельга, толькі дапамагаць.

Увесь час актывісты ледзь не кожны сонечны дзень выходзілі ў двор як на работу. Дэкрэтніцы — днём па меры магчымасці, усе астатнія — пасля асноўнай работы.

— Вельмі грунтоўная была падтрымка ад нашых дэпутатаў. Без іх, напэўна, не атрымалася б так аднавіць двор: дапамаглі купіць і ўсталяваць агароджу для дзіцячай пляцоўкі, бо побач праезная частка, і гэта было вельмі важна. Дырэктар КЖРЭУП «Савецкае», дэпутат Міхаіл Прус прапанаваў нам аднавіць зялёную зону. Мы забяспечвалі кветкамі і саджанцамі для алеі, а работнікі камунальнай арганізацыі знялі дзёран і зрабілі новы роўны газон.

Выйшла так, што больш як 150 кватэр аказала грашовую дапамогу. Цяпер 11 чалавек — гэта актывісты, якія дапамагаюць прыбіраць тэрыторыю, фарбаваць, рамантаваць абсталяванне. Ёсць уласны кухар — Алена Грахоўская, якая гатуе пачастункі на святы двара, дыджэй — Аляксандр Клімкоў, які адказвае за музычнае суправаджэнне, мастак — Таццяна Міхаленка, яна ўпрыгожвае малыя архітэктурныя формы.

Нечаканая перамога

Паназіраць за «дваровым цудам» на праспект Рэчыцкі за гэты час прыязджалі дэпутаты розных узроўняў і з розных рэгіёнаў. Аднойчы трапілі нават на свята з самаварам і абаранкамі, якое ладзілася ў гэтым двары ўжо не раз.

Марына Марціновіч кажа, што цяпер многія з іншых мікрараёнаў Гомеля шукаюць яе каардынаты, тэлефануюць. Просяць парады, як наладзіць работу актывістаў у дварах.

Па выніках 2018 года ў гарадскім конкурсе мясцовага самакіравання КТГС «Праспект цудаў» стаў пераможцам. Рашэннем Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў па выніках конкурсу за 2019 год па вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва гарадскіх, пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў, а таксама органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання КТГС «Праспект цудаў» прызнаны пераможцам у намінацыі «Найлепшы калегіяльны орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання».

Дыплом першай ступені прадугледжвае грашовую ўзнагароду ў памеры 100 базавых велічынь.

— Было нечакана, ад таго не менш прыемна атрымаць перамогу ў конкурсе, — адзначае Марына Марціновіч. — Нас папярэдзілі, што гэтыя сродкі можна будзе накіраваць на набыццё гульнявога абсталявання. У «Праспекта цудаў» шмат новых планаў па пашырэнні прасторы для адпачынку, але яшчэ больш ініцыятыў па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Таму без інфармацыйнай падтрымкі дэпутатаў у гэтым пытанні не абысціся.

Старшыня камітэта адзначае, што на этапе ўвасаблення сваіх ідэй па навядзенні парадку ў двары яны сутыкнуліся з неабходнасцю ўстанавіць камеры відэаназірання, якія дазволяць захаваць абсталяванне. Цяпер жыхары мараць цалкам аднавіць пакрыццё на баскетбольнай пляцоўцы, якая ўжо стала любімым месцам гульні для школьнікаў у іх двары.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

ІНІЦЫЯТЫВА

Серафімова пад знакам Грыфона

Маладая сям'я пераехала ў вёску з Мінска і ўладкоўвае зямлю сваіх продкаў

Жыць у суладдзі з навакольным светам, захоўваць і прымнажаць прыродныя багацці, гадаваць сваіх дзяцей там, дзе жылі продкі, ствараючы прыгожую грамадскую прастору. Такі прынцып у Аляксея Галубовіча і яго жонкі Аліны Бардашун. Каля трох гадоў таму маладая сям'я пераехала ў вёску Серафімова, што за дванаццаць кіламетраў ад сталіцы.

У 1990-х гадах тут выдзелілі ўчасткі для будаўніцтва пасёлка работнікам Мінскага аўтамабільнага завода. Бацька Аліны таксама атрымаў зямлю. Пасля катэджны пасёлак зліўся з аднайменнай вёскай. Пасля развалу Савецкага Саюза многія, каму пашчасціла займець участак, сутыкнуліся з суровай рэальнасцю — недахопам сродкаў, каб закончыць будоўлю. Праўда, тут паспелі правесці газ, электрычнасць, асфальтавалі цэнтральную вуліцу, збіраліся пусціць трамвай з Мінска і нават праклалі каляіну. На гэтым усе зручнасці цывілізацыі, бадай, і закончыліся. Частыя аварыі на водаправодзе не найлепшым чынам паўплывалі на асфальтавае пакрыццё — яно разбураецца. Цяпер у пасёлку, можна сказаць, адсутнічае нармальная інфраструктура. Недзе за сто метраў цераз дарогу ад дамоў знаходзіліся дзве пажарныя сажалкі ў атачэнні дрэў. Гэтыя вадаёмы ўжо даўно не выкарыстоўваліся па прызначэнні, зарасталі хмызняком, ператвараліся ў балота, да таго ж мясцовыя жыхары зрабілі тут сапраўдную звалку.

Аліна і Аляксей задумаліся над тым, як зрабіць жыццё ў Серафімове больш камфортным і паказаць яго тутэйшым, якія мараць бачыць сваю малую радзіму прыгожай і ўнікальнай. Але сужэнцы разумелі: каб распачаць справу, неабходны хоць якія сродкі. Аліна падала заяўку на конкурс сацыяльных праектаў «Актывія 2.0» і выйграла грант, эквівалентны 2000 долараў. Гэтая сума дала старт праекту па ўладкаванні грамадскай прасторы на сажалках — Аліна сама яго намалявала.

— Частку грошай патрацілі на тое, каб наняць Мінскае ПМС. Меліяратары прыгналі экскаватар і ачысцілі дно вадаёмаў ад глею, карчоў, рознага хламу, — кажа Аляксей. — Далей справу заканчвалі разам з мясцовымі жыхарамі. Затым прыцягнулі архітэктараў з вядомай студыі Level80 architects і 22 студэнтаў-архітэктараў з Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта з тым, каб яны стварылі праект менавіта для Серафімова.

ulej.by

Праект для Серафімова.

Праект атрымаўся арыгінальны, звязаны з гісторыяй і назвай пасёлка. («Серафім» перакладаецца з грэчаскай мовы як «Грыфон».) Усе зоны парка злучаюцца адзінай дарожкай-насцілам у выглядзе сузор'я Грыфона. Пункты сузор'я адзначаны асобнымі «зоркамі». Вядома, давялося прыкласці шмат сіл і намаганняў і для таго, каб выраўняць і спланаваць пляцоўкі. З зямлёй дапамог «Метрабуд».

— За дзень мінулым летам нам даставілі 740 кубаметраў зямлі. Мы наняслі тэхніку і падрыхтавалі ўчасткі для пляцовак, — згадвае Аляксей. — Без дапамогі вяскоўцаў, канешне, было б значна цяжэй. Сярод іх ёсць сапраўдныя майстры — сталяры, зваршчыкі. Яны ніколі не адмовілі ў дапамозе, удзельнічаюць у суботніках. У нашым чаце зарэгістравана каля 270 чалавек. Мы вырашаем не толькі пытанні ўладкавання парку. Напрыклад, трыццаць гадоў не маглі запусціць каналізацыю, цяпер справа зрушылася з месца. Дапамагаюць у вырашэнні нашых праблем па меры магчымасці кіраўнік Мінскага райвыканкама Іван Крупко, старшыня Міханавіцкага сельсавета Святлана Давальцова. У нас ёсць таксама супольнасць з 5-6 чалавек, якія актыўна прапаноўваюць і прасоўваюць ідэі.

Сапраўды, за даволі кароткі час зроблена для добраўпарадкавання шмат. Але, як лічыць мой суразмоўнік, неабходна зрабіць яшчэ больш. Добраўпарадкаванне — гэта паступальны і бесперапынны працэс. З'явілася дзіцячая пляцоўка з атракцыёнамі. У планах — стварэнне зоны актыўнага адпачынку для дзяцей і падлеткаў, дарослых, арганізацыя месца, дзе можна было б даваць майстар-класы, будаўніцтва альтанкі, уладкаванне малых архітэктурных формаў, пірса для рыбакоў. І многа чаго іншага.

— І што або хто вас падштурхнуў да такой цяжкай справы? — пацікавілася ў Аляксея.

— У нас падрастае пяцігадовая дачка Сафія. Менавіта яна стала матыватарам да стварэння праекта. Калі мы пераехалі ў Серафімова на пастаяннае месца жыхарства, то не ведалі ні суседзяў, ні вяскоўцаў, бо не было ні адной лаўкі, ні аднаго месца, дзе змаглі б сабрацца. На пачатку праекта пазнаёміліся амаль з усімі жыхарамі, усе бытавыя пытанні абмяркоўваем і вырашаем разам. Цяпер у парк маці прыходзяць з дзеткамі, ім ёсць дзе пагуляць.

— А назад у Мінск не хочацца?

— Радыя, што адтуль выбраліся. Галоўнае, што тут чыстае паветра, прыгожая прырода, ёсць чым заняцца. Наш праект — гэта не проста дзіцячая пляцоўка. Гэта прыклад таго, што ўсё магчыма, калі мы разам і хочам зрабіць сваю радзіму лепшай. Дарэчы, я вельмі здзівіўся: калі на краўдфандынгавай пляцоўцы пачаў збіраць грошы на ажыццяўленне праекта, то адгукнуліся многія людзі, і сярод іх — тыя, хто не мае дачынення да нашай мясцовасці. Я ніколі не ведаў Юрыя Агеева, які пералічыў 1000 рублёў. З цяжкасцю яго знайшоў, каб падзякаваць. І калі ў нас ёсць такія неабыякавыя грамадзяне, якія імкнуцца зрабіць свой родны кут чысцейшым, камфортнейшым, зручнейшым для жыцця, значыць, усё атрымаецца.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

КУТОК ПРЫГАЖОСЦІ НА ЎЕЗДЗЕ Ў ВЁСКУ

Навядзенне парадку на першым месцы ў ліку вясновых клопатаў сельвыканкама

Помнік на брацкай магіле ў Воўчыне.

Старшыню Воўчынскага сельскага Савета Віктара Палешчука ўдалося застаць каля новай вясковай капліцы, у рабочым адзенні з усім інструментам. Віктар Пятровіч прыйшоў абкасіць тэрыторыю, якую не так даўно добраўпарадкавалі, абсадзілі маленькімі елачкамі. «Капліцу ўзвялі некалькі гадоў таму на месцы былой царквы ў памяць пра храм, — расказаў старшыня. — А гэтае месца, дзе раней была пустка, вырашылі агульнымі намаганнямі ператварыць у сквер. Вось і даглядаем».

Ваенныя мемарыялы

У ліку вясновых клопатаў мясцовай улады на першым месцы, як заўсёды, стаіць добраўпарадкаванне. А гэтым разам, паводле слоў кіраўніка, асаблівую ўвагу ўдзялілі знакам баявой і воінскай славы. Іх на тэрыторыі — прыкладна паўтара дзясятка. Усе памятныя мясціны былі прыведзеныя ў парадак і дагледжаныя да 75-годдзя Перамогі. Работу распачалі яшчэ два гады таму. Менавіта ў 2018-м зрабілі асноўную частку рэканструкцыі помніка на брацкай магіле ў Воўчыне. Гэты мемарыял быў узведзены ў сярэдзіне 60-х гадоў і па зразумелых прычынах патрабаваў рамонту. Работу ўключылі ў план і прафінансавалі з раённага бюджэту. Цяпер месца пахавання абаронцаў Радзімы цалкам прыведзенае ў парадак. З'явіліся мемарыяльныя табліцы з прозвішчамі 24 салдат і афіцэраў, якія тут пахаваныя, а таксама ўвекавечаныя імёны землякоў, што загінулі на франтах і ў партызанах. Гэтай вясной палепшылі сцежкі, высадзілі кветкі. Адначасова было праведзена добраўпарадкаванне каля помніка ахвярам Халакосту. На тэрыторыі цяперашняй вёскі, тады тут быў пясчаны кар'ер з ярам, фашысты забілі 395 чалавек яўрэйскай нацыянальнасці з Воўчына і Чарнаўчыц. Каля помніка мірным жыхарам паклалі з боку дарогі сцяжыну з пліткі.

У справе прывядзення ў парадак помнікаў значную дапамогу аказалі мясцовыя сельгаспрадпрыемствы. У Ставах брацкую магілу добраўпарадкавала ААТ «Александрыя-Агра», у Навасёлках памятны знак на брацкай магіле і навакольную тэрыторыю рамантавалі з удзелам гаспадаркі «Усход-Камянец». На тэрыторыі сельсавета, як ужо гаварылася, шмат памятных мясцін. І ніводную не абышлі ўвагай. Напрыклад, на могілках у Ставах ёсць пахаванне часоў Першай сусветнай вайны, а таксама магіла ўдзельніка Грамадзянскай вайны. Іх таксама прыбралі і дагледзелі, дапамагалі, дарэчы, валанцёры з Брэсцкага краязнаўчага музея. А яшчэ ў гэтай мясцовасці шмат памятных мясцін пачатку вайны. Побач — дзяржаўная граніца, якая была парушаная 22 чэрвеня 41-га года. Пра тое сведчыць, напрыклад, магіла пяці абаронцаў 62-га ўмацаванага раёна. Ёсць месцы баёў вайскоўцаў пагранічных застаў, іх таксама дагледзелі напярэдадні дня Перамогі. «Так што юбілейную дату мы сустракалі з гонарам, — падсумаваў кіраўнік мясцовай улады. — Але работа працягваецца. Цяпер вось шукаем спонсараў, каб зрабіць мемарыяльныя табліцы для асобных помнікаў, дзе не ўсе прозвішчы пазначаны».

Марыя БОЛБАС.

Помнікі гісторыі і культуры

Дапамагаюць падтрымліваць парадак і царкоўныя прыходы. Каля царквы ў вёсцы Навасёлкі адной толькі пліткі паклалі 600 «квадратаў». Упрыгожылі тэрыторыю вернікі вакол Воўчынскай царквы. Дарэчы, двор храма суседнічае з тэрыторыяй мемарыяла каля брацкай магілы, так што добраўпарадкавалі ўсё агульнымі намаганнямі.

Ёсць тут і касцёл. Воўчын — мясціна асаблівая, радзіма апошняга польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, месца былой рэзідэнцыі яго маці, тутэйшай магнаткі — княгіні Чартарыйскай. Ад былых палацаў амаль нічога не засталося, толькі касцёл, які да пачатку гэтага стагоддзя прыйшоў у заняпад, фактычна быў разбураны. Рэстаўрацыяй помніка гісторыі і культуры доўгі час займаўся польскі архітэктар Віктар Вільк. Ён самастойна шукаў фундатараў і аднаўляў помнік архітэктуры позняга барока. Вядома, справа прасоўвалася не так хутка, як хацелася б. Ды за восем гадоў, пачынаючы з 2008-га, незвычайнай прыгажосці Траецкі касцёл, які паспеў пабываць сховішчам для мінеральных угнаенняў, у якога абрынуўся дах з гадзіннікавай вежай, набыў былыя абрысы. Фасад быў адноўлены, калі ў 2016 годзе раптоўна памёр архітэктар... За гэты час нічога істотнага не зроблена ў справе рэстаўрацыі. Прыкладна год таму мясцовая гаспадарка зрабіла свой унёсак у аднаўленне культурнай святыні, пакладзена сцежка да галоўнага ўвахода ў касцёл, расчышчана тэрыторыя. Мясцовая ўлада таксама зрабіла ўнёсак у добрую справу, прыбрана лішняя расліннасць, знеслі шэраг старых дрэў, напрыклад, канадскага клёна, які тут сам насеяўся і закрываў агляд на касцёл.

Вядома, касцёлу патрабуюцца яшчэ немалыя капіталаўкладанні. Пінская каталіцкая епархія ўжо аб'яўляла збор сродкаў, але пакуль на рахунку, відавочна, недастаткова, каб зрабіць нешта грунтоўнае. Прыход жа вельмі маленькі, яго складаюць у асноўным пажылыя людзі.

Мясцовыя ініцыятары і рупліўцы

А вось жыхары невялічкай вёскі Катэра, якая размешчана побач з Воўчынам, прадэманстравалі дружнае супрацоўніцтва прадстаўнікоў дзвюх канфесій. Пад кіраўніцтвам старасты Сцяпана Саванчука яны сабралі грошы, арганізавалі суботнік і ўладкавалі мясціну на ўездзе ў вёску. Там цяпер побач стаяць два крыжы — праваслаўны і каталіцкі. Вакол расчышчаная пляцоўка, высаджаныя невялікія туі, падрыхтаваны клумбы для кветак. А цераз дарогу, бліжэй да аўтобуснага прыпынку, размясцілася альтанка. Яе таксама прывялі ў парадак і ўпрыгожылі. Там можна камфортна адпачыць і ў чаканні транспарту, і проста, калі ёсць вольная хвіліна. Побач зусім хутка расцвітуць розныя кветкі, найперш старанняміжонкі старасты, дэпутата сельскага Савета, настаўніцы Ларысы Саванчук. Ларысу Анатолеўну дружна падтрымалі тутэйшыя гаспадыні.

Здавалася б, дробязь, кавалачак прыгажосці пры дарозе, але надае настрой любому падарожніку, што праязджае міма. Побач праходзіць шаша, якая злучае Воўчын з Высокім, і рух тут даволі інтэнсіўны. Кожны міжволі звяртае ўвагу на гэты з любоўю ўладкаваны куточак. А для таго, каб такія куткі паяўляліся, варта знайсціся энтузіястам справы.

Ну вось такім, як Марыя Аляксандраўна Болбас з Воўчына. У яе кветнік і тэрыторыя вакол дома так дагледжаны і ўладкаваны, што хоць сёння змяшчай на старонкі часопіса па дамашняй гаспадарцы і вучы людзей рацыянальнаму выкарыстанню зямлі. Градкі з клубніцамі разбітыя нібы пад шнурочак, так бездакорна выглядаюць рады з ягадамі, якія пачынаюць зацвітаць. Наводдаль зелянеюць часнок і цыбуля. А з боку вуліцы высаджаны самыя розныя кветкі. Некаторыя дружна цвітуць, іншыя толькі ўздымаюцца ад зямлі, каб парадаваць стракатай карцінай пазней. Клумбы зроблены ў выглядзе розных геаметрычных фігур. Здавалася б, нічога асаблівага, калі не прымаць да ўвагі той факт, што Марыя Аляксандраўна 1936 года нараджэння, і ўсю гэтую прыгажосць стварае сваімі рукамі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Камянецкі раён.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 30 июня 2019 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предмета торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Местонахождение имущества: (лоты № 1, 4) г. Калинковичи, ул. Ленина, 3, (лоты № 2, 5) г. Житковичи, ул. К. Маркса, 21, (лот № 3) г. п. Лельчицы, ул. Советская, 32		
1	**Трактор МТЗ-82.1** (рег. знак № ГТ 3879), инвентарный номер № 51028 (по бух. учету), год выпуска – 1993	1 142,23	114,22
2	**Трактор МТЗ-80** (рег. знак № ЕА 5229), инвентарный номер № 10151 (по бух. учету), год выпуска – 1994	1 535,71	153,57
3	**Трактор МТЗ-80.1** (рег. знак № ЕА-3 7901), инвентарный номер № 5001010 (по бух. учету), год выпуска – 1993	1 142,23	114,22
4	**Прицеп-емкость специальная ПСЕ-Ф-12.5Б** (рег. знак № ЕА 3965), инвентарный номер № 51024 (по бух. учету), год выпуска – 1994	514,22	51,42
5	**Прицеп ПСЕ-Ф-12.5Б** (рег. знак № ЕК 1430), инвентарный номер № 51316 (по бух. учету), год выпуска – 1995	471,19	47,12

Продавец: Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (0232) 79-68-24, 8 (029) 629-28-67 – Берецин Андрей Анатольевич – товаровед Гомельского филиала РУП «Белпочта». **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (получатель – Гомельский филиал РУП «Белпочта»):** р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в филиале № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, ул. Барыкина, 94, BIC AKBBBY21302, УНП 400395996, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 29 мая 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 26 июня 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом имущества** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)». **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».**

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

УНП 700049607

Открытое акционерное общество
«Дорожно-строительный трест № 3» –
продавец (организатор аукциона)
30 июня 2020 года в 15.00
проводит открытый аукцион по продаже имущества, расположенного по адресу:
Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278В:

- **СТОЛЯРНЫЙ ЦЕХ – капитальное строение с железобетонным ограждением площадью 543,0 кв. м**
- **ЦЕМЕНТНЫЙ СКЛАД**

Суммарная начальная цена продажи с НДС составляет 81 625,00 белорусского рубля.

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **30.06.2020 в 15.00** по адресу: **г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.**
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: **г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33;** дата: **26.06.2020 г.;** время: **17.00.**
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
8. Извещения о проведении открытых аукционов по продаже вышеназванного имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы в газете «Звязда» и на официальном сайте ОАО «ДСТ № 3».

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона)
ИНФОРМИРУЕТ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
(со снижением первоначальной стоимости на 50 %)
по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ПСВ»

ЛОТ № 1: ЗДАНИЕ НАВЕСА – ГАРАЖА НА 10 АВТОМАШИН, инв. № 250/С-27982, 538,4 кв. м.

Адрес: г. Полоцк, ул. Успенская, 3 / 5. Обременения: аренда.
Земельный участок: кадастровый номер 223850100004001384, 0,0721 га, право постоянного пользования.
Начальная цена, бел. руб. с НДС – 27 097,77.

Аукцион состоится 19.06.2020 в 11.00
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»
ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ООО «Альком»** (УНП 400036252) в лице ликвидатора Голынского К.Н., тел. 8 (044) 763-10-40.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **30 июня 2020 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

ПРЕДМЕТ ТОРГОВ

1. Капитальное строение с инв. № 330/С-6477 общ. пл. 1380 м² (здание административное), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 341500000011000027 площадью 0,1414 га по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Малинина Н.И., 38.

Начальная цена предмета торгов – 1 494 000,00 бел. руб. без НДС.

2. Капитальное строение с инв. № 330/С-34903 общ. пл. 220 м² (двухэтажное кирпичное здание для технических вспомогательных работ); капитальное строение с инв. № 330/С-13604 общ. пл. 2077,60 м² (производственное здание); капитальное строение с инв. № 330/С-6445 общ. пл. 2135,80 м² (арматурный цех и ремонтная мастерская), расположенные на земельном участке с кадастровым номером 341500000013000024 пл. 1,0864 га по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, Михалковский с/с, 40. Начальная цена предмета торгов – 627 700,00 бел. руб. без НДС.

Телефон для ознакомления и осмотра +375 29 698-53-03.

Для участия в торгах необходимо в срок с 30.05.2020 г. 09.00 по 29.06.2020 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять до наступления даты проведения торгов. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня их проведения оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты: не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов.

ЗА ЗДАРОВЫ СПОСАБ ЖЫЦЦЯ!

«Лідар» рыхтуецца да адкрыцця

Маштабная будоўля, што вядзецца на Навагрудчыне, завяршаецца

Гаворка ідзе аб фізкультурна-аздараўленчым комплексе па вуліцы Драздовіча ў райцэнтры, які можна лічыць аб'ектам апошніх не толькі гадоў, але і дзясяцігоддзяў. Справа ў тым, што такіх комплексаў тут наогул не было і вось, нарэшце, усе, для каго здаровы спосаб жыцця не пусты гук, атрымаюць цудоўны падарунак.

Спытаеце, адкуль грошы? Крыніца фінансавання — сродкі, якія Навагрудскі райвыканкам атрымаў ад продажу выпушчаных ім аблігацый. Праект падрыхтавалі спецыялісты праектнага інстытута «Гроднаграмадзянпраект», а будаўніцтвам займаецца Лідская ПМК № 169. Агульны кошт праекта складае каля 12 мільёнаў рублёў. Будоўлю распачалі пазалетась у лістападзе і вось яна набліжаецца да свайго лагічнага заканчэння. Цяпер тут завяршаюцца пусканаладачныя работы. Хутка — адкрыццё.

Трэба сказаць, што комплекс — сам немаленькі (на будынак пайшло 450 тон металаканструкцый) і разам з прылеглай тэрыторыяй займае плошчу больш за 19 тысяч «квадратаў», дзе ўжо абсталяваны вялікая паркоўка, сцяжынкі, тэрыторыя добраўпарадкавана. Да 75-годдзя Вялікай Перамогі тут з'явілася прыгожая алейка з 75 туй.

Самае вялікае памяшканне «Лідара» — гэта прасторная спартыўная зала для гульнявых відаў спорту, з сучасным электронным табло. Займацца ў ёй змогуць футбалісты, валейбалісты, баскетбалісты і гандбалісты. А назіраць за гульнёй — 751 глядач.

Акрамя гэтага ёсць 25-метровы басейн з пяццю дарожкамі, трэнажорная зала з сучасным абсталяваннем і зала для заняткаў фітнесам. Пасля фізічных практыкаванняў дапаможа расслабіцца саўна, а падсілкавацца можна будзе ў кафэ, разлічаным на 30 месцаў.

Дарэчы, тэхнічна-камунікацыйная частка дазволіць весці анлайн-трансляцыі мерапрыемстваў, што будуць праводзіцца ў комплексе. Немалаважным з'яўляецца і тое, што фізкультурна-аздараўленчую ўстанову змогуць наведваць людзі з абмежаванымі магчымасцямі.

Пасля ўводу «Лідара» ў эксплуатацыю тут размесціцца раённая ДЮСШ № 2. Спецыялісты, якія забяспечаць работу комплексу, ужо ёсць, сфарміраваны таксама трэнерскі штаб.

— Усе мы знаходзімся ў прадчуванні ўрачыстага адкрыцця комплексу — выдатны падарунак атрымаюць і спартсмены, і аматары здаровага спосабу жыцця, — цытуе **намесніка старшыні райвыканкама Святлану КАРАЛЬКО** раённая газета «Новае жыццё». — Гораду патрэбны такі шматфункцыянальны аб'ект, таму, несумненна, «Лідар» будзе запатрабаваны ў жыхароў не толькі Навагрудчыны, але і суседніх раёнаў.

ПРАЕКТЫ І РАШЭННІ

НОВЫ МАНЕЖ

Цэнтр для заняткаў тэнісам з крытымі кортамі з'явіцца ў Гродне.

Аб'ект узвядуць на пляцоўцы па вуліцы Горкага побач з аквацэнтрам, паведаміў **начальнік аддзела спорту і турызму Гродзенскага гарвыканкама Яўген АРОДЗЬ.** Зараз вядуцца падрыхтоўчыя работы. Усяго на гэтым месцы з'явяцца шэсць тэнісных кортаў, чатыры з іх будуць крытыя. Сценамі і дахам для манежа стане так званая паветраапорная канструкцыя.

Такія ж, дарэчы, выкарыстоўваліся ў Гродне для будаўніцтва футбольнага манежа і крытай хакейнай пляцоўкі ў лесапаркавай зоне Пышкі.

З'явяцца таксама адміністрацыйна-бытавы комплекс, раздзявальні. На кортах будзе выкладзена сучаснае спецыялізаванае пакрыццё. Узводзіцца новы аб'ект пры падтрымцы Беларускай тэніснай федэрацыі.

Цяпер у Гродзенскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе тэніса займаецца каля 150 дзяцей. Адкрыццё новага аб'екта дасць магчымасць павялічыць колькасць дзяцей, якія займаюцца гэтым відам спорту, павысіць якасць падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву, стане штуршком для развіцця тэніса ў рэгіёне.

Між іншым, цэнтр таксама будзе аказваць паслугі насельніцтву: аматары тэніса атрымаюць магчымасць гуляць на сучасных кортах. Манеж будзе прымаць спаборніцтвы рознага ўзроўню. Адзначым яшчэ, што раней крытых кортаў у Гродне не было.

Паводле БелТА.

АКТУАЛЬНА

Дарогі чакаюць мадэрнізацыі

У якім стане дарогі ў паўночным рэгіёне нашай краіны, якая мяжуе з Расійскай Федэрацыяй і Еўрапейскім саюзам? На вырашэнні якіх дарожных праблем трэба ў першую чаргу засяродзіцца?

Тэма мясцовых дарог актуальная для рэгіёнаў. У Віцебску нядаўна абмеркавалі яе на абласным узроўні. У прыватнасці, рэалізацыю дзяржаўнай праграмы па развіцці і ўтрыманні аўтадарог на 2017—2020 гады. Асаблівасць Віцебшчыны ў тым, што тут найбольшая колькасць у Беларусі населеных пунктаў — каля 6,3 тысячы, адпаведна і шмат дарог, якія іх злучаюць. У Прыдзвінні знаходзіцца больш за палову рэспубліканскіх гравійных дарог.

Старшыня аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ выказаў надзею, што ў профільным міністэрстве і ва ўрадзе ўрэшце «пачуюць» просьбы аб падтрымцы. У прыватнасці, ужо даўно наспела неабходнасць рэканструкцыі дарогі Віцебск — Мінск. Пра гэта гутарка ідзе даўно, але... Вось і цяпер прадстаўнік Міністэрства транспарту і камунікацый, які прысутнічаў на вышэйзгаданым пасяджэнні, агучаную праблему (і не толькі яе), як гаворыцца, узяў на заметку.

Згодна з рашэннем абласнога Савета дэпутатаў, з бюджэту на 2020 год на дарожную гаспадарку выдаткавалі каля 35,3 мільёна рублёў. На думку кіраўніцтва камітэта па архітэктуры і будаўніцтве аблвыканкама, гэтага недастаткова. Напрыклад, 93 % ад агульнай працягласці дарог рэспубліканскага значэння (каля 2,8 тысячы км) эксплуатуюцца з перавышэннем нарматыўных міжрамонтных тэрмінаў. Аб'ём сродкаў на іх утрыманне сёлета каля 25,1 мільёна рублёў ці менш за палову неабходнай сумы.

А яшчэ трэба падтрымліваць дарогі мясцовага значэння. Іх працягласць складае больш за 15 тысяч кіламетраў і толькі 78,3 % з цвёрдым пакрыццём, а 21,7 % — грунтавыя.

Дзе браць сродкі на дарогі? Старшыня аблвыканкама ўпэўнены, што замест таго, каб прасіць грошай з бюджэту, дарожнікі павінны імкнуцца самастойна іх зарабляць. Напрыклад, можна далучыцца да ўзвядзення і добраўпарадкавання аб'ектаў сельскагаспадарчага прызначэння. І няблага зарабляць на гэтым. Як вядома, у гаспадарках не хапае будаўнічай тэхнікі, спецыялістаў і рабочых. Таксама сёння дарожнікам неабходна актыўна выкарыстоўваць грошы, якія сэканомілі сёлетняй зімой.

Як і заўсёды, вялікая роля ў маніторынгу за станам мясцовых наземных артэрый належыць сельскім Саветам. Іх аператыўная інфармацыя вельмі каштоўная для абласных дарожнікаў, асабліва ў час зацяжных дажджоў, ураганаў, перападаў тэмпературы на глебе.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Віцебская вобласць.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 28 мая 2020 года.**